

САКРЭТЫ ПОСПЕХУ УЛАДЗІМІРА ШАНТАРОВІЧА

11

КНІГА – ГІСТОРЫЯ ПРА СТВАРАЛЬНУЮ ПРАЦУ

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 САКАВІКА 2023 г. СУБОТА № 52 (29932)

КОРАТКА

• **Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь павіншаваў кіраўніцтва, асабовы склад, ветэранаў унутраных войскаў са 105-й гадавінай з дня ўтварэння ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.**

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Ісламскай Рэспублікі Іран Эбрахіма Раісі з 30-годдзем устанаўлення дыпламатычных адносін.

• **Беларусь да 2030 года разлічвае ў тры разы нарасціць аб'ём выручкі ў сферы мікраэлектронікі.**

• БУТБ і «Белтаможсэрвіс» пашыраюць супрацоўніцтва ў сферы трансгранічнага гандлю.

• **«Вялікі камень» і НАН абмеркавалі супрацоўніцтва ў галіне інавацыйнай тарфяной прадукцыі.**

• Кіраўніцтва Амурскай вобласці азнаёмілася з дарожна-будаўнічай тэхнікай «АМКАДОРа».

ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У развіцці транспартных зносін на прасторы СНД ёсць зрухі. Фарміруюцца новыя каналы экспарту і імпарту, мультымадальныя транспартныя калідоры, ствараецца спрыяльны рэжым ажыццяўлення перавозак грузаў у прыярытэтных напрамках. Праводзяцца тэставыя перавозкі ў транзітных зносінах Казахстан — Расія — Беларусь з мэтай арганізацыі перавозак па міжнародных транспартных калідорах СНД з выкарыстаннем лічбавых сэрвісаў».*

З першых вуснаў

# «У БАРАЦЬБЕ ЗА ПЕРАДЗЕЛ СВЕТУ ВЫЗНАЧАЛЬНАЕ ЗНАЧЭННЕ МАЮЦЬ ТЭХНАЛОГІІ»

## Аб чым Прэзідэнт гаварыў падчас нарады, прысвечанай перспектывам развіцця айчыннай мікраэлектронікі

**Нарада адбылася на базе навукова-вытворчага холдынга дакладнага машынабудавання «Планар». Перш чым перайсці да абмеркавання сур'ёзных пытанняў, кіраўнік дзяржавы заслухаў даклад генеральнага дырэктара прадпрыемства аб фінансава-эканамічным стане і перспектывах ААТ «Планар». Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з найбольш перспектыўнымі распрацоўкамі оптыка-механічнага прэцызіённага тэхналагічнага абсталявання, пабудаванага з выкарыстаннем лазерных тэхналогій. Пацікавіўся Прэзідэнт і тым, наколькі вострым для прадпрыемства з'яўляецца кадравае пытанне: у прыватнасці, ці дастаткова ў мікраэлектроніцы маладых спецыялістаў.**



Фота БелТА

### «Нельга толькі канкурыраваць і замыкацца ў нацыянальных межах»

Напачатку нарады, прысвечанай пытанням развіцця айчыннай мікраэлектронікі, Прэзідэнт заўважыў, што, як усе зразумелі пасля невялікай экскурсіі і агляду некаторага абсталявання, мікраэлектроніка — тое, без чаго сёння трактар не арэ, аўтамабіль не рухаецца. «Нават матацыкл, веласіпед выкарыстоўваюць электроніку, я ўжо не кажу, што самалёты не лятаюць, ракеты таксама ў космас не адпраўляюцца — гэтым усё сказана, — падкрэсліў беларускі лідар. — Чаму такая ўвага сёння ў свеце, і не толькі ў свеце, а перш за ўсё на постсавецкай прасторы, у нас і ў Расіі, да гэтых праблем і пытанняў?»

Прэзідэнт назваў не асноўныя прычыны, але немалаважныя. Па яго словах, барацьба за гэтыя вытворчасці і рынкі з'яўляецца прычынай ваенных сутыкненняў. «На шчасце, інтуітыўна, дзесьці Бог дапамог, я не першы раз звяртаюся ў сваім прэзідэнцкім жыцці да гэтага пытання, што ў пэўнай ступені выратавала ад распаду гэтую галіну», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ен звярнуў увагу на тое, што месца сустрэчы з'яўляецца сімвалічным і гістарычным. «Менавіта тут, на «Планары», у 60-х гадах мінулага стагоддзя быў створаны мозг і сэрца мікраэлектронікі Савецкага Саюза, — нагадаў беларускі лідар.

СТАР. 2

Вогненныя вёскі

# ХАТЫНЬ: ЗАБЫЦЬ НЕЛЬГА ДАРАВАЦЬ

## У рэдакцыі «Звязды» адбыўся круглы стол, прысвечаны 80-годдзю трагедыі, якая стала сімвалам бяды нашага народа

**Гэты чорны дзень навечна ўпісаны ў гісторыю Беларусі. 22 сакавіка 1943 года прыгожая лясная вёска назаўсёды знікла з карты свету. У вогнішчы, распаленым нелюдзямі, загінулі 149 жыхароў, большасць з якіх — 75 чалавек — былі дзецьмі...**

**Хатынь — несуцішны боль, незагойная рана беларусаў. І колькі мы будзем памятаць аб трагедыі, якая ранняй вясной адбылася ў гэтай лагойскай вёсцы, аб усіх населеных пунктах, знішчаных у гады акупацыі фашыстамі, столькі можам быць упэўнены ў тым, што падобнае ніколі не паўторыцца на нашай і без таго шматпакутнай зямлі. Ці ёсць «белыя плямы» ў хатынскай трагедыі, чаму ў сувязі з апошнімі падзеямі ў свеце трагедыя Хатыні і тысяч іншых беларускіх вёсак, спаленых нацыстамі разам з людзьмі, набывае асаблівае гучанне, ці завяршылася рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу і што мы павінны перадаць моладзі, каб тэма гістарычнай памяці ў далейшым заставалася адной з прыярытэтных, — адказы на гэтыя пытанні гучалі падчас круглага стала.**

СТАР. 4-5

Абітурыент-2023

# Фларысты і спецыялісты па інфармацыйнай бяспецы

## Якія яшчэ спецыяльнасці адкрыюцца ў беларускіх каледжах?



**Пяты Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства, які пройдзе ў Мінску 13—16 мая, варта наведаць абітурыентам бягучага і двух наступных гадоў. У гэтым упэўнена намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі — начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА. У фінале будзе прадстаўлена 47 кампетэнцый: ад аўтамабільных тэхналогій, кулінарнага мастацтва, рэстараннага сэрвісу, візуальнага мерчэндайзінгу да мабільнай робататэхнікі, інжынернага дызайну CAD і тэхналогій праектавання будынкаў. Як адзначыла спецыяліст, у падлеткаў і іх бацькоў будзе магчымасць на свае вочы ўбачыць сутнасць многіх сучасных прафесій, іх адметнасці і разбурыць стэрэатыпы, якія існуюць у грамадстве наконт рабочых спецыяльнасцяў.**

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на ІІ квартал 2023 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «У БАРАЦЬБЕ ЗА ПЕРАДЗЕЛ СВЕТУ ВЫЗНАЧАЛЬНАЕ ЗНАЧЭННЕ МАЮЦЬ ТЭХНАЛОГІІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Наш знакаміты зямляк, нобелеўскі лаўрэат Жарэс Іванавіч Алфёраў, расказваў, што неяк у 80-х гадах сустрэў міністра электроннай прамысловасці ўсяго Савецкага Саюза Уладзіслава Калеснікава. І той прызнаўся, расказаў яму: «Прачнуўся сёння ў халодным поце, прыснілася, што «Планара» няма. А раз няма «Планара» — няма больш у СССР электроннай прамысловасці». Гэтым усё сказана. Гэта было сапраўды сэрца электроннай прамысловасці, тут былі засяроджаны асноўныя «мазгі» электроннай прамысловасці Савецкага Саюза».

Беларускі лідар згадаў, што, калі стваралася гэтая прарыўная галіна, інтэлектуальна і фінансава яе маглі пацягнуць толькі Амерыка, Савецкі Саюз і Японія. Нягледзячы на тое што ў СССР працавалі яшчэ сумежныя прадпрыемствы — у Расіі, Прыбалтыцы, — мазгавы цэнтр знаходзіўся тут, у Беларусі.

Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, у ліхія перабудовачныя і постперабудовачныя гады захаваць гэты набытак — нават не нацыянальны, а сусветны — удалося толькі Беларусі. «Я цудоўна памятаю, як мяне ўгаворвалі прадаць, зачыніць гэтыя прадпрыемствы, прапаноўвалі завесці ўсё з Захаду, — сказаў Прэзідэнт. — Дзякую Богу, як бы ні было цяжка, краіна захавала і «Планар», і «Інтэграл», і БелОМА, і «Гарызонт», і віцебскі «Маналіт», але, самае галоўнае, навуковую інфраструктуру ў гэтай навукаёмістай галіне. 30 гадоў прайшло — мы бачым, што ў барацьбе за перадзел свету вызначальнае значэнне маюць тэхналогіі. Той, хто валодае імі, здольны не толькі выстаяць, але і ўстанавіць у будучыні свае правілы гульні. Так званы цывілізаваны, дэмакратычны заходні свет без усялякага сумлення выкарыстоўвае тэхналагічныя рычагі ўздзеяння, уводзячы санкцыі, спрабуючы паставіць на калені непажаданыя дзяржавы — сваіх канкурэнтаў».

Аднак навука, па словах кіраўніка дзяржавы, не стаіць на месцы. «Навукоўцы кааперыруюцца, у развіцці мікраэлектронікі ўжо нельга толькі канкурыраваць і замыкацца ў нацыянальных межах, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Беларускія вытворцы сёння займаюць сваю нішу на сусветным рынку. І гэта нягледзячы на глабальны трэнд у бок ужо



Фота БелТА.

нават не мікра-, а нанаэлектронікі, калі з'явіліся некалькі гульцоў, якія валодаюць тэхналогіямі парадку чатырох нанаметраў.

Пры гэтым Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што дастаткова буйныя мікрасхемы беларускай вытворчасці застаюцца запатрабаванымі. «Яны надзейныя, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Але, як я разумею, нам трэба ад гэтых вялікіх, глабальных, мікрасхем рухацца ў гэты бок — у гэтыя маленькія нанаметры».

## «Самае галоўнае, каб вучоныя, канструктары і практыкі разумелі, што трэба рабіць і куды ісці»

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў кааперацыі з айчыннай грамадзянскай і абароннай прамысловасцю ствараюцца ўнікальныя прадукты. «Без вас немагчымыя былі б беспілотнікі, робаты, станкі з лічбавым праграмным кіраваннем, прынцыпова новыя віды ўзбраення, бытавая тэхніка сусветнага ўзроўню і многае іншае, — прывёў прыклады беларускі лідар. — Таму поле для працы і далейшага развіцця ў нас найвялікшае».

У першую чаргу, гэта Расія. Наша краіна валодае ўсімі неабходнымі кампетэнцыямі, каб задаволіць запатрабаванні расійскага рынку пасля сыходу адтуль заходніх прадпрыемстваў. «Гэта шанц, і мы яго павінны выкарыстаць, — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. — «Расатам», «Раскосмас», «Расэлектроніка» — аб'ёмы партнёрскіх пагадненняў павінны толькі расці».

Каласальную цікавасць да беларускай мікраэлектронікі праяўляюць і інвестары. Прамое таму пацвярджэнне — нядаўні візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Зімбабвэ і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. «З намі гатовы супрацоўнічаць і хочуць інвеставаць у развіццё нашай прамысловасці, у тым ліку мікраэлектроннай, — паведаміў Прэзідэнт. — Прытым аб'ёмы грошай нават не абмяркоўваюцца. Мы вельмі шчыльна аб гэтым гаварылі з прэзідэнтам Эміратаў. Ен выказаў каласальную зацікаўленасць у рабоце з дружалюбнай краінай — Беларуссю».

Добрыя фінансавыя ўкладанні, па словах кіраўніка дзяржавы, — гэта магчымасць карэннай мадэрнізацыі вытворчай базы, распрацоўкі новых тэхналогій і, як вынік, павелічэнне экспарту. «Самае галоўнае, што мяне непакоіць, каб вучоныя, канструктары і практыкі разумелі, што трэба рабіць і куды ісці, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Калі ў нас такія людзі ёсць, то грошы для гэтага заўсёды знойдуцца. А такія людзі ёсць».

Прэзідэнт нагадаў, што ў чэрвені мінулага года нарада па пытаннях развіцця айчыннай мікраэлектронікі ўжо праводзілася, падчас яе былі вызначаны асноўныя кірункі з улікам нашых кампетэнцый і магчымасцяў ва ўмовах санкцыйнага ціску. «Як мне дакладваюць, ужо ёсць некаторыя зрухі, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Сумесна з расійскім бокам сфарміравалі пералік крытычна важнай кампанентнай базы, якая будзе праводзіцца на нашых прадпрыемствах, распрацавана «дарожная карта», план па яе асваенні. Шэраг элементаў для расійскіх прадпрыемстваў мы ўжо пачалі пастаўляць. Падпісана пагадненне аб стварэнні сумеснага беларуска-расійскага цэнтра па распрацоўцы і вырабе фоташаблонаў. Ён дазволіць выконваць сумесныя доследна-канструктарскія работы, звязаныя з заменай беларускіх і расійскіх спажыўцоў ад імпартных паставак».

Акрамя таго, урадам зацверджана Праграма па развіцці мікраэлектроннай прамысловасці Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 года. Аляксандр Лукашэнка запытаў, наколькі праліччаны і амбіцыйныя нашы перспектывы, ці ўзятая планка ў далейшым развіцці гэтай галіны. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, што патрэбна для стварэння вытворчасці больш высокага тэхналагічнага ўзроўню. Пры гэтым нагадаў, што інвестары, гатовыя фінансаваць праекты, ёсць. Далажылі Прэзідэнту і аб тым, як рухаецца работа па засваенні пераліку неабходных для расійскай прамысловасці электронных кампанентаў.



Па выніках нарады беларускім лідарам было агучана галоўнае патрабаванне — паскарацца, наколькі гэта магчыма. Пры гэтым у некалькі разоў павінна ўзрасці роля навукі. Па яго словах, вельмі добра, што на вытворчасцях развіта свая навука. Без вялікай навукі, на думку кіраўніка дзяржавы, якасна рухацца далей не зможам. У цяперашні момант гэта найважнейшае пытанне.

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

Як распавёў у размове з журналістамі **генеральны дырэктар ААТ «Планар» Сяргей АВАКАЎ**, нарада, праведзеная на ўзроўні Прэзідэнта краіны, павышае статус праблем, якія разглядаюцца, паказвае, што з боку і кіраўніка дзяржавы, і ўрада да развіцця мікраэлектронікі ёсць цікавасць. Па яго словах, вынікам нарады стане інтэнсіфікацыя дзейнасці ўсіх удзельнікаў гэтага працэсу, паказчыкі будуць дасягнуты больш хутка і стануць найбольш важкімі.

«Супрацоўніцтва з Расіяй пайшло ўверх: узрасла колькасць заказаў, — адзначыў кіраўнік прадпрыемства, кажучы пра «наступствы» санкцыйнага ціску. — Дзеля справядлівасці варта сказаць, што гэта адбылося яшчэ ў 2021 годзе. З'явіліся доўгатэрміновыя кантракты, колькасць ахвотных набыць наша абсталяванне расце. Цяпер мы законтрактаваны да 2026 года і толькі думаем аб тым, як паспець усё зрабіць. Запускаем праект па пашырэнні вытворчасці, хоць толькі ў мінулым годзе скончыўся праект па мадэрнізацыі вытворчасці, — гэта проста неабходна».

Прадукцыяй прадпрыемства поўнасцю забяспечваецца беларускі рынак. «З «Інтэгралам» у нас падпісана маршрутная карта да 2026 года, дзе распісана ўся патрэба «Інтэграла» ў абсталяванні, мы гэтую патрэбу задаволім», — удакладніў Сяргей Авакаў.

Як звярнуў увагу **міністр прамысловасці Аляксандр РАГОЖНІК,** Прэзідэнт удзяліў асаблівую ўвагу развіццю мікраэлектронікі ў Рэспубліцы Беларусь. «Па сутнасці, гэта базавая галіна для ўсяго прамысловага комплексу, асабліва навукаёмістая галіна, — адзначыў ён. — Такімі тэхналогіямі валодае зусім мала дзяржаў у свеце: Японія, Злучаныя Штаты Амерыкі, шэраг іншых. І ў гэтай лінейцы побач з імі стаім і мы. Мы захавалі свой патэнцыял у развіцці мікраэлектронікі, разумеем, куды ідзём. Прэзідэнтам была пастаўлена задача рухацца хутчэй, нарошчваць аб'ёмы вытворчасці, захапіць рынкі, якія сёння вызваліліся ў сяброўскіх краінах, і развівацца ў падвоеным-патроеным тэмпе».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Францыі падчас начных пратэстаў супраць пенсіённай рэформы затрымана звыш 300 чалавек



Пасля абвяшчэння прэм'ер-міністрам Элізабэт Борн рашэння аб выкарыстанні артыкула канстытуцыі для правядзення рэформы ў абыход галасавання ў ніжняй палаце парламента — Нацыянальным сходзе — у гарадах Францыі на вуліцы выйшлі тысячы абураных грамадзян. У многіх выпадках гэтыя пратэсты пераходзілі ў сутычкі з паліцыяй, часам у пагромы вітрын і гарадской гаспадаркі, падпалы смецевых бакаў. Паліцыя неадназова ўжывала спецсродкі для разгону пратэстоўцаў. Як паведаміў у эфіры тэлеканала RTL міністр унутраных спраў Францыі Жэральд Дарманен, падчас акцый было затрымана 310 чалавек, у тым ліку 258 толькі ў Парыжы.

### Усеагульныя выбары ў Лівіі могуць адбыцца ў чэрвені



Пра гэта заявіў спецпрадстаўнік генсека ААН па Лівіі, кіраўнік Місіі арганізацыі па падтрымцы ў Лівіі Абдулай Бацілі, паведаміла ТАСС. «Выбары могуць адбыцца ў сярэдзіне чэрвеня», — адзначыў Бацілі, словы якога прывёў тэлеканал AlHadath. Ён адзначыў, што да гэтага часу павінна быць «складзена дакладная дарожная карта па правядзенні выбараў». Паводле слоў спецпрадстаўніка генеральнага сакратара ААН, на папярэднім этапе «лівійскія бакі павінны будуць весці перагаворы напрамую або праз сваіх прадстаўнікоў пры ўдзеле спецыяльнага камітэта высокага ўзроўню». Гэты камітэт, дадаў Бацілі, з'яўляецца «новым спосабам забяспечыць нацыянальную адказнасць саміх лівійцаў за выбарчы працэс».

### Летні адпачынак брытанцаў аказаўся пад пагрозай з-за забастоўкі пашпартыстаў



Брытанцы, якія збіраюцца атрымаць новыя пашпарты перад летнім сезонам адпачынкаў, могуць сутыкнуцца з працяглай затрымкай у іх выдачы. Справа ў тым, што дзяржслужачыя, якія займаюцца гэтым, плануюць правесці пяцітыднёвую забастоўку ў пікавы для такіх запытаў перыяд, паведаміла Bloomberg. Агенцтва адзначае, што больш за тысячу членаў прафсаюза грамадскіх і камерцыйных паслуг пачнуць забастоўку 3 красавіка, пратэстуючы супраць прапанаванага павышэння зарплаты на 2 працэнты. Усе пашпартныя сталы ў Вялікабрытаніі, у тым ліку ў Лондане, перастануць працаваць. Як вядома, за аналагічны перыяд летась па пашпарты ў Вялікабрытаніі звярнуліся амаль мільён чалавек.

Наш узровень

# Першыя па малаку

## На Брэстчыне прайшлі жывёлагадоўчыя «дажынкі»

**Цяпер Брэсцкая вобласць забяспечвае чвэрць аб'ёмаў усяго беларускага малака. Апошнія гады рэгіён трымае ўпэўненае лідарства па краіне ў малочнай жывёлагадоўлі, паказчыках удояў малака ад каровы і ўносіць свой важкі ўклад у харчовую бяспеку краіны. Але так было далёка не заўсёды. Напрыклад, у 2004 годзе галоўнай задачай называлі дасягненне агульнарэспубліканскіх паказчыкаў.**

### Самы пасяховы праект

Традыцыйнае ўшанаванне перадавікоў галіны па выніках работы ў мінулым годзе адбылося на гэтым тыдні ў Століне. Прагучалі не толькі добрыя словы ў адрас віноўнікаў урачыстасці — называліся асноўныя складнікі паспяховай работы.

У гэты дзень не раз звярталіся да статыстыкі. Яна найбольш красамоўна адлюстроўвае работу герояў дня. Брэсцкую вобласць традыцыйна называюць аграрнай. У структуры эканомікі рэгіёна сельская гаспадарка складае 14,3 працэнта. Калі дадаць галіну перапрацоўкі, то гэта будзе больш за палову ўсёй народнай гаспадаркі. Асновай агропрамысловага комплексу рэгіёна з'яўляецца жывёлагадоўля, якая дае звыш 80 працэнтаў выручкі. А 60 працэнтаў эканомікі жывёлагадоўчай галіны складае рэалізацыя малака. Напрыклад, за дзесяцігоддзе гадавая вытворчасць малака павялічылася больш чым на 700 тысяч тон. Істотна вырасла пагалоўе малочнага статка. І, галоўнае, значна павялічылася яго прадукцыйнасць. У малочнай жывёлагадоўлі Брэсцкая вобласць з 2007 года зрабіла каласальны рывок і выйшла па ўдоях на першае месца ў краіне.



Аператар машыннага даення ААТ «АграНіва» Камянецкага раёна Зоя ЯРОШЫК.

Развіццё малочнай жывёлагадоўлі спецыялісты называюць самым паспяховым праектам у эканоміцы Брэсцкай вобласці. Праект стаў не толькі эканамічным, інвестыцыйным, але і цалкам сацыяльным, таму што з уводам у строй новых ферм вырашаюцца пытанні занятасці на сяле, павышэння зарплаты, росту ўзроўню жыцця, развіцця сферы паслуг.

Менавіта з улікам запатрабаванасці прадукцыі жывёлагадоўлі на знешніх і ўнутраным рынках быў выбраны гэты кірунак. Землі ў рэгіёне не самыя ўрадлівыя, а ўтрыманне буйной рагатай жывёлы не патрабуе пераважнай колькасці збожжа ў кармавой базе, як, скажам, свінагадоўля альбо птушкагадоўля. Карова, як вядома, акрамя камбікорму, спажывае траву ў розных выглядах.

Штуршок для развіцця — будаўніцтва і мадэрнізацыя малочна-таварных ферм у адпаведнасці з даручэнннем Прэзідэнта ад 2009 года. З той пары штогод у вобласці ўводзяць у эксплуатацыю па некалькі дзясяткаў новых альбо рэканструяваных жывёлагадоўчых комплексаў. Цяпер у рэгіёне іх налічваецца каля 360.

### Сусветны ўзровень

**Старшыня аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА,** які шчыра дзякаваў жывёлаводам за працу, падкрэсліў, што ад іх залежыць устойлівая работа мяса і малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў, харчовая бяспека краіны і яе экспартны патэнцыял. Толькі за мінулы год вобласць паставіла на экспарт 76 працэнтаў сваёй малочнай і 41 працэнт мясной прадукцыі, у цэлым на суму 1,3 мільярда долараў. Гэта на 37 працэнтаў перавысіла паказчык папярэдняга года. За гэтымі лічбамі стаіць, несумненна, штодзённая праца работнікаў ферм. Як і за тым, што цяпер сярэдні ўдой на карову ў рэгіёне набліжаецца да сямі тысяч кілаграмаў. Ёсць комплексы, якія можна без перабольшвання назваць фабрыкамі малака. Напрыклад, у гаспадарцы «Моладава-Агра» Іванаўскага раёна атрымліваюць ужо больш за 13 тон малака ад каровы за год.



**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ** скарыстаў магчымасць, каб адзначыць працавітасць і гаспадарлівасць столінцаў:

— У палешукоў свой падыход да зямлі. Тут кожны яе лапік выглядае прыгожым і дагледжаным. Там, дзе былі пясчаныя кар'еры, цвітуць сады. Гэтак жа скрупулёзна ставяцца да справы і жывёлаводы раёна — нездарма па выніках мінулага года яны выйшлі на першае месца па вобласці.

**Міністр сельскай гаспадаркі краіны Ігар БРЫЛО,** які прыехаў асабіста адзначыць брэсцкіх жывёлаводаў, сказаў, што на Брэстчыну трэба раўняцца:

— Тыя вынікі, якіх вобласць дасягнула ў справе малочнай жывёлагадоўлі, несумненна, можна назваць дасягненнямі сусветнага ўзроўню.

Міністр падкрэсліў значнасць экспартнага патэнцыялу рэгіёна. Цяпер вобласць забяспечвае 28 працэнтаў экспарту. Адна толькі гэтая лічба сведчыць пра важкі ўклад рэгіёна ў экспартны складнік, ды і валавая вытворчасць тут адна з самых высокіх. Паводле слоў міністра, на Брэстчыне выбралі правільную стратэгію, якая дэманструе вынікі.

### Сістэмны падыход

А якімі намаганнямі агучаныя паказчыкі дасягнуты, нагадалі ў камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама. Стаўка робіцца на комплексны, сістэмны падыход. Гэта найперш мадэрнізацыя вытворчасці, укараненне новых тэхналогій. Але ж не менш значнымі выглядаюць кармавая база, генетыка і племянная работа, вырошчванне маладняку, аднаўленне статка. Асаблівы ўпор робіцца на інфарматызацыю працэсаў. Калі сёння гаворыцца, што жывёлаводы трымаюць першыя пазіцыі ў краіне, то гэта азначае найперш паглыбленую работу па паляпшэнні якасных паказчыкаў малочнай прадукцыі і аднаўленчай здольнасці жывёл, а таксама павышэнне яе генетычнага патэнцыялу, пароднага складу. У селекцыйнай рабоце вялікая роля належыць «Брэстплемпрадпрыемству». Яго рэсурсы дазваляюць весці мэтанакіраваную селекцыйную работу. Племянны ўлік ва ўсіх гаспадарках вобласці вядзецца ў інфармацыйнай сістэме «Племсправа». Ва ўказаную сістэму ўнесена фактычна 100 працэнтаў жывёлы.

Спецыялісты ўвесь час трымаюць руку на пульсе. Напрыклад, убачылі, што ёсць праблемы з генетычным патэнцыялам статка, кінулі пэўныя намаганні і сродкі на вырашэнне праблемы. Затым у прыярытэце аказалася вырошчванне рамонтных цялушак. Іншымі словамі, пастаянна ацэньваецца ўзровень развіцця кожнага складніка і падцягваецца тое, што адстае.

### Пашана — па працы

На форуме жывёлаводаў, які праходзіў у Століне, была наладжана выстава-дэгустацыя прадукцыі перапрацоўчых прадпрыемстваў. Як слушна заўважалі наведвальнікі выставы, брэндавыя брэсцкія перапрацоўшчыкі здабываюць прыхільнасць спажыўца выдатнай якасцю сваіх тавараў. Але ж з няякаснай сыравіны высакаякасны прадукт харчавання ніяк не зробіш, таму працаўнікам вёскі і на дэгустацыі ёсць чым ганарыцца.

На сцэну ў гэты дзень падымалася па ўзнагароды больш за сто чалавек: аператары машыннага даення, лабаранты, тэхнікі-асемянатары, спецыялісты, кіраўнікі.



Старшыня СВК «Узыходзячая зара» Таццяна ДЗЕМІДЗЮК.

Усе яны датычныя да тых салідных вынікаў, якія дэманструе Брэсцкая вобласць у жывёлагадоўлі. Сярод раёнаў — пераможцаў спаборніцтва — узнагарод удастоены Столінскі, Пружанскі, Кобрынскі. У ліку лепшых гаспадарак — ААТ «Парахонскае» Пінскага, ААТ «Нарутавічы» Бярозаўскага, а на першым месцы сёлета — СВК «Узыходзячая зара» Кобрынскага раёна, якую ўзначальвае Таццяна Дземідзюк. Летась ад каровы тут атрымалі па 10 145 кілаграмаў малака, пры гэтым гадавая прыбаўка на кожную карову склала 805 кілаграмаў.

За працу ўшаноўвалі найлепшых, такім чынам, атрымаліся своеасаблівыя «дажынкі» на ніве жывёлагадоўлі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

На слыху

# ПА СПРАВЕ TUT.BY ВЫНЕСЕНЫ ПРЫГАВОРЫ

**Былыя галоўны рэдактар мастацка-рэдакцыйнага аддзела tut.by Марына Золатава і гендырэктар ТАА «ТУТ БАЙ МЕДЫЯ» (прызнана экстрэмісцкай арганізацыяй) Людміла Чэкіна прыгавораны да 12 гадоў калоніі кожная. Такое рашэнне вынес 17 сакавіка Мінскі гарадскі суд, перадае БелТА.**

Адбываць пакаранне Чэкіна і Золатава будуць у калоніі агульнага рэжыму.

З матэрыялаў крымінальнай справы вынікае, што ТАА «ТУТ БАЙ МЕДЫЯ», будучы рэзідэнтам Парка высокіх тэхналогій, мела падатковыя льготы. Тым часам сэрвіс kupi.tut.by не быў уласнай распрацоўкай ТАА, а пры яго функцыянаванні выкарыстоўвалася праграмнае забеспячэнне іншай кампаніі.

Каб атрымаць падатковыя прэферэнцыі як рэзідэнт ПВТ, таварыства ўкараніла схему па драбненні бізнесу. Было створана падкантрольнае ТАА «Паблішэр бокс», на якое фармальна перавялі функцыі аказання пасрэдніцкіх паслуг па распрацоўцы, вырабе рэкламных матэрыялаў, размяшчэнні рэкламы на інтэрнэт-рэсурсах удзельнікаў дагаворных адносін, іншых паслуг з выкарыстаннем іншага праграмнага забеспячэння. Гэта было неабходна для працягу атрымання выручкі.

Як распавёў следчы па асабліва важных справах Следчага камітэта Ілья Пракапенка ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1», падчас следства былі дапытаны супрацоўнікі адміністрацыі ПВТ, сябры экспартнага і назіральнага савета. Высветлілася, што з улікам устаноўленых падчас следства абставін у «ТУТ БАЙ МЕДЫЯ» ў прынцыпе не было падстаў уступаць і знаходзіцца ў складзе рэзідэнтаў ПВТ.

Паводле інфармацыі следчага, былі ўстаноўлены перапіскі паміж асноўнымі заснавальнікамі «ТУТ БАЙ МЕДЫЯ» — іх называлі топамі. Яны абмяркоўвалі пытанні продажу часткі долі замежным інвестарам, у тым ліку прадстаўнікам Расійскай Федэрацыі. Адпаведна разлічваўся рыначны каэфіцыент за кошт мінімізацыі падатковых расходаў у сувязі з рэзідэнцтвам у ПВТ.

Як раней адзначылі ў Генпракуратуры, у выніку ў бюджэт у 2019—2021 гадах недаплачаны падаткі на больш як Br3 млн.

Следчы па асабліва важных справах Следчага камітэта Ілья Пракапенка ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» таксама заявіў, што інфармацыйная дзейнасць TUT.BY была накіравана на распальванне сацыяльнай варожасці.

«У ходзе расследавання крымінальнай справы ўстаноўлены шэраг артыкулаў, у якіх змяшчаліся прыкметы экстрэмісцкай накіраванасці, а сама інфармацыйная дзейнасць TUT.BY была накіравана на распальванне сацыяльнай варожасці па прыкмеце іншай сацыяльнай прыналежнасці, што ў далейшым было ўстаноўлена ў тым ліку і экспертамі рэспубліканскіх экспертных медкамісій», — расказаў Ілья Пракапенка.

«У псіхалінгвістыцы ёсць такая рэч, як вобраз ворага, — удакладніла эксперт у галіне псіхалінгвістыкі. — Гэты вобраз ствараецца шляхам падбору пэўных моўных сродкаў, такіх як рытарычныя пытанні, метафары, параўнанні. Аж да ўжывання ў рыфмаванай, вершаванай форме слоў, ва неўласцівых ім значэннях і гэтак далей. Зразумела, што ўсе гэтыя прыёмы ўжываліся аўтарамі, асабліва выразна відаць гэты эмацыянальны складнік на падзеле двух лагераў: пратэстоўцаў, якія светлыя, радасныя, цудоўныя, непераўнальныя, і ўсіх астатніх, хто ім процістаіць, — дзеючай улады і прадзяржаўна настроеных людзей».

Што тычыцца трох іншых абвінавачаных, якія ўцяклі, крымінальная справа ў дачыненні да іх прыпынена вытворчасцю па справе да іх вышуку. Размова ідзе аб былых галоўным рэдактары палітыка-эканамічнага блока навін мастацка-рэдакцыйнага аддзела Вользе Лойцы, рэдактары Алене Талкачовай і юрысконсульце Кацярыне Ткачэнцы.

# ХАТЫНЬ: ЗАБЫЦЬ НЕЛЬГА ДАРАВАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**У дыскусіі прынялі ўдзел намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Лілія АНАНІЧ, дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» Артур ЗЕЛЬСКІ, вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Анатоль КРЫВАРОТ, кіраўнік Творчай майстэрні архітэктара Леаніда Левіна, архітэктар Галіна ЛЕВІНА, загадчык Цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Аляксей ЛІТВІН, намеснік кіраўніка следчай групы па расследаванні справы аб генацыдзе — намеснік начальніка ўпраўлення Генеральнай пракуратуры па наглядзе за расследаваннем асабліва важных крымінальных спраў Сяргей ШЫКУНЕЦ, сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Павел АЛЕКСА.**

***— Ці засталіся яшчэ ў гісторыі знішчэння Хатыні «белыя плямы»?***



**А. Літвін:** — Як гэта ні дзіўна, але яны ёсць. Аднак я не звужаў бы гэтае пытанне толькі да Хатыні. Што такое Хатынь? «Хатынь» — гэта сусветна вядомы мемарыял усім спаленым, вынішчаным разам з жыхарамі беларускім вёскам, сімвал усяго таго жудаснага і пачварнага, што тварылася ў адносінах да населеных пунктаў, перш за ўсё да людзей, у гады Вялікай Айчыннай вайны. Хатынскі мемарыял — гэта помнік чалавечых пакут, чалавечай болі і смутку, вечны напамін аб жудасных наступствах ваенных злачынстваў нацызму. Трагедыя адбылася амаль напрыканцы вайны, фактычна за год да вызвалення тэрыторыі Беларусі, якая ў гэты час (амаль на 60 %) знаходзілася пад партызанскім кантролем. Мяне як гісторыка і сумленнага грамадзяніна цікавіць, як магло здарыцца, што акупанты ажыццяўлялі такую практыку, як вынішчэнне населеных пунктаў, спальванне людзей, расстрэлы, павешанні. Знаёмства з гістарыяграфіяй паказвае, што гэта было зусім не выпадковай справай, а ажыццяўленне загадзя распрацаванай палітыкі нацыстаў, якое пачалося з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны. Чаму існуюць «белыя плямы»? Справа ў тым, што гісторыю Хатыні можна напісаць як з пункту гледжання нямецкіх дакументаў, так і па матэрыялах Генеральнай пракуратуры, партызанскіх дакументаў, паводле сведчанняў мясцовага насельніцтва навакольных вёсак. Сваю інтэрпрэтацыю падзей мелі і паліцаі-калабаранты. Разглядаючы гэтую праблему, высветлілі, што першым у Хатынь прыехаў не 118-ы паліцэйскі батальён, як лічылася дагэтуль, а дзірлевангераўцы. Па іншых матэрыялах, усё наадварот. Гэта сведчыць аб тым, што любы факт, які мы цяпер даследуем, не можа быць на сто працэнтаў адназначны. Доўгі час дакументы па Хатыні знаходзіліся на сакрэтным захоўванні, таму абвінавачваць гісторыкаў у «белых плямах», якія былі раней у гэтым пытанні, нельга.



**А. Крыварот:** — 118-ты паліцэйскі батальён пакінуў крывавы след не толькі ў Хатыні, а ўвогуле на тэрыторыі трох абласцей: Мінскай, Віцебскай і Баранавіцкай. Хатынь — найбольш трагічнае злачынства, здзейсненае гэтымі нелюдзямі. На тэрыторыю Лагойшчыны батальён трапіў у канцы 1942 — пачатку 1943 года. Яшчэ да Хатыні адбылося некалькі карных набегаў на вёскі: былі спалены хаты, забіты людзі. Нямала жудасных распраў падрадзленне здзейсніла падчас карнай аперацыі «Котбус». Падчас прачэсвання лесу ў Налібоцкай пушчы байцы 118-га паліцэйскага батальёна выявілі зямлянкі з яўрэйскім насельніцтвам і закідалі іх гранатамі. Тых, хто ўцалеў (жанчыны і дзіця), расстралялі. Такіх злачынстваў у падраздзялення — не адзін дзясятак. Гэта былі паслугачы ў нацыстаў, якія пакорліва выконвалі іх загады. Аднак не трэба забываць, што ў расправе над хатынцамі ўдзельнічала і група Дзірлевангера.

**А. Літвін:** — Я хацеў бы падкрэсліць, што гэта была частка дзяржаўнай акупацыйнай палітыкі, распрацаванай нацысцкай партыяй за шмат гадоў да пачатку Другой сусветнай вайны. З яе пачаткам гэтая палітыка перакінулася на ўсе тыя краіны, якія захапілі немцы. Але ў дачыненні да Францыі, Галандыі, Нарвегіі, Югаславіі, Чэхаславакіі і Польшчы яна не праводзілася ў поўнай меры. У класічным выглядзе нацысцкая палітыка пачалася толькі з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Гітлераўцы лічылі, што тут, на тэрыторыі Савецкага Саюза, можна рабіць усё. Уявіце: у Гомелі яшчэ знаходзіцца ЦК Кампартыі Беларусі (да канца жніўня 1941 года), а немцы, ужо пачынаючы з канца чэрвеня 1941-га, праводзяць карныя экспедыцыі, так званыя пацыфісцкія акцыі, на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі. І самай вялікай была аперацыя «Прыпяцкія балоты», якая з сярэдзіны ліпеня да канца жніўня 1941 года праводзілася ў два этапы. Была спалена вялізная колькасць вёсак, адпрацоўваліся планы вынішчэння яўрэйскага насельніцтва, барацьбы з пачаткам партызанскага руху. Гэта рабілася з першага дня вайны. Дакументы, якія сведчылі аб фактах генацыду, у снежні 1941 года трапілі да нашых ваеннаслужачых, часткова былі надрукаваны ў савецкім друку, перададзены ўсім замежным пасольствам — свет не мог паверыць, што такое магло быць. Такім чынам, палітыка масавага вынішчэння насельніцтва Беларусі пачала ажыццяўляцца яшчэ задоўга да таго, як з'явіліся вынікі партызанскай дзейнасці. Хаця, мяркуючы па справаздачах немцаў за ліпень 1941 года, яны змагаліся з партызанамі.



**С. Шыкунец:** — У гісторыі Хатыні сёння няма «белых плям». Гэта дакладна. У адрозненне ад сваіх апанентаў, якія ставяць пад сумненне гістарычныя факты, у тым ліку гісторыю знішчэння Хатыні, я спасылаюся на матэрыялы крымінальных спраў асуджаных: карнікаў, нямецкіх злачынцаў, іх памагатых. Ужо дайшло да таго, што асобныя таварышы ставяць пад сумненне існаванне такога чалавека, як Іосіф Камінскі.



**Л. Ананіч:** — Гэта акурат той выпадак, калі варта прымяняць Закон «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму».

**С. Шыкунец:** — Так і будзем рабіць. «Белых плям» няма! Усё вельмі дакладна расстаўлена па месцах. Зразумелая ў знішчэнні Хатыні роля калабарацыяністаў. Даказаны ўдзел у гэтай карнай акцыі 118-га паліцэйскага батальёна (украінскія калабарацыяністы), падраздзяленняў Дзірлевангера, куды таксама ўваходзілі грамадзяне Украіны. Гэтая сітуацыя сёння поўнасцю, па эпізодах, паказана ў матэрыялах крымінальнай справы: што з'явілася прычынай, чаму менавіта гэтыя падраздзяленні прыехалі сюды, як выйшлі на Хатынь, як спальвалі, хто стаяў у ачапленні. Допытаны нават зяць Камінскага, які расказваў, як Іосіф прыйшоў з Хатыні ўвесь абгарэлы, брудны. Допытаны і памагатыя фашыстаў — паліцаі. Па адной крымінальнай справе яны былі асуджаны разам з Васюрам, начальнікам штаба 118-га батальёна, а потым, адбыўшы пакаранне, выступалі сведкамі па крымінальнай справе беларускага калабарацыяніста Катрука.

**Л. Ананіч:** — Хатынь — гэта сімвал нашага болю, сімвал пакут і няскоранасці беларускага народа, сімвал адзіна правільнай пазіцыі краіны, якая годна ўвекавечыла (і працягвае гэта рабіць) памяць мільёнаў савецкіх грамадзян, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Навукоўцы, прадстаўнікі Генеральнай пракуратуры палічылі колькасць спаленых вёсак, загінулых, вызначылі вінаватых у гэтых трагедыях. Але хіба ж да канца мы даведаемся пра тыя думкі, праклёны, якія несліся ў неба?...

***— Сённяшнія падзеі ў свеце нагляднa дэманструюць: гісторыя нічому не вучыць. Чаму з урокаў, дадзеных у гады нямецка-фашысцкай акупацыі, не зроблены высновы?***

**Л. Ананіч:** — Дзякуючы Генеральнай пракуратуры, якая ініцыявала расследаванне генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд, сёння ўся краіна ў гэтай тэме. Пасыл пайшоў ад самога жыцця. Што стала адбывацца на геапалітычным контуры? Мы бачым, што фальсіфікацыя гістарычнай памяці ўзята на ўзбраенне тымі, хто хацеў бы адмяніць праўду аб падзеях Другой сусветнай вайны, па-новаму перарабіць карту свету. Тое, што адбываўся генацыд беларускага народа, не ўкладваецца ў гэтыя геапалітычныя канцэпты, бо калі на Захадзе прызнаюць (а нам трэба дабіцца гэтага!), што гэта быў генацыд беларускага народа, яны не проста павінны выплаціць нам кампенсацыю, а на каленях паўзці і прасіць прабачэння. Ды яны на сто стагоддзяў наперад не расплацяцца, бо невымерная цана нашага болю! Замест гэтага мы бачым, што адбываецца. Там, на жаль, узраслі атрутныя неанацысцкія зярняты і даюць свой атрутны плён. Мы бачым гэта на прыкладзе падштурхоўвання вайны да апошняга ўкраінца. Толькі мудрасць беларускага народа і палітыка нашага Прэзідэнта ратуюць нас і, спадзяюся, будуць далей ратаваць ад таго, каб на нашай зямлі гэтае атрутнае насенне ніколі не магло ўзрасці.

**А. Літвін:** — Непасрэдна карныя аперацыі праводзіліся спецыяльнымі войскамі СС і паліцаямі, аднак, як сведчаць архіўныя дакументы, з 1941 да 1944 года ў іх бралі ўдзел і вайсковыя часці Вермахта, што дагэтуль на Захадзе ўсяляк імкнуцца адмаўляць. Па даных на 13 жніўня 1941 года, на акупаванай тэрыторыі Беларусі было знішчана 13 788 чалавек. У верасні — кастрычніку 1941 года на тэрыторыі Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Брэсцкай абласцей было праведзена яшчэ 10 аперацый, у выніку якіх, згодна са справаздачнымі дакументамі карнікаў, былі знішчаны яшчэ 7162 чалавекі. І гэта толькі пачатак вайны! Адначасова з аперацыяй «Прыпяцкія балоты» праводзілася спецыяльная аперацыя па высяленні насельніцтва і спальванні вёсак у Белавежскай пушчы. У ліпені — снежні 1941 года разам з жыхарамі былі знішчаны тры вёскі, якія не адноўлены пасля вайны, восем населеных пунктаў, якія пасля адрадзіліся, — усяго 896 двароў, 1447 чалавек з 4862 даваенных жыхароў гэтых вёсак. Дзевяць населеных пунктаў былі знішчаны з часткай насельніцтва, яны не адрадзіліся пасля вайны. Усяго, па даных кнігі «Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941—1944)» і апошніх кніг, выдадзеных Генеральнай пракуратурай, падчас карных аперацый у 1941 годзе было знішчана 158 населеных пунктаў з 3933 жыхарамі. 138 населеных пунктаў былі знішчаны з часткай жыхароў, яны аднавіліся пасля вайны. Пры гэтым, мяркую, што не ўлічвалася яўрэйскае насельніцтва. У 1942 годзе ў сувязі з шырокім разгортваннем партызанскага руху гэтыя акцыі маюць масавы характар. Практычна заўсёды падчас правядзення карных аперацый супраць партызан выпальваліся вёскі, вынішчалася мірнае насельніцтва. Такімі рашучымі мерамі акупанты спадзяваліся, па-першае, знішчыць партызанскі рух, па-другое, выканаць свае планы вызвалення тэрыторыі і па знішчэнні насельніцтва.



**А. Зельскі:** — На цяперашні момант, па інфармацыі Генеральнай пракуратуры, у гады акупацыі на тэрыторыі Беларусі пацярпела звыш 10,5 тысячы сельскіх населеных пунктаў.

**С. Шыкунец:** — Расследаванне крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд працягваецца, таму гэта яшчэ не канчатковая лічба. Аднак ужо зразумела: маштаб трагедыі нашмат большы, чым гэта лічылася раней. Дастаткова згадаць Трасцянец. Раней лічылася, што ў канцлагеры загінула 206 тысяч чалавек. Сёння мы адназначна заяўляем аб звыш паўмільёна загінулых. У працы знаходзіцца вялізны пласт архіўных дакументаў з Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, заканчваем вывучэнне крымінальных спраў у архівах КДБ. Гэта вельмі каштоўныя крыніцы інфармацыі, з якіх мы ў тым ліку даведваемся аб раней невядомых населеных пунктах, знішчаных акупантамі і іх памагатымі. Нас чакаюць дзясяткі тысяч крымінальных спраў, некаторыя з іх яшчэ знаходзяцца пад грыфам «сакрэтна». Адна з асноўных мэт — паказаць рэальны маштаб трагедыі. Шкоду, нанесеную нашай краіне акупантамі, дзяржаўная камісія палічыла: у золаце гэта больш як 43 тысячы тоны, або звыш 2 трыльёнаў у англійскіх фунтах.

**Л. Ананіч:** — Як нацыя, якая клапоціцца аб будучыні, мы павінны расставіць усе акцэнты менавіта ў гэты перыяд, калі адбываецца агрэсіўная атака на гістарычную памяць, калі так званы калектыўны Захад робіць усё дзеля таго, каб перапісаць гісторыю. І фактычна яе ўжо перапісалі: у музейных экспазіцыях, замацаваўшы ў канвенцыях і дактрынах, якія прымаюцца на еўрапейскіх пляцоўках. Міжнародная парламенцкая канферэнцыя па тэме Вялікай Перамогі, якую мы праводзілі ў мінулым годзе, паказала, што, на жаль, нават на постсавецкай прасторы не ўсе краіны аднолькава стаўляцца цяпер да падзей мінулага. У нас жа, беларусаў, адказнасць перад судом гісторыі — захаваць праўду і памяць аб Вялікай Айчыннай вайне. Бо не раскажуць аб ёй ні дзеці, якія нават не нарадзіліся, ні партызаны, якія ўжо сышлі, ні салдаты, ні афіцэры — амаль ніхто ўжо не скажа. І сёння Беларусь гэтую праўду сведчыць, мы запісалі аб гэтым у Канстытуцыі, мы гэтую кнігу памяці адкрылі і не збіраемся яе закрываць. Яна заўсёды будзе ляжаць перад вачыма кожнага пакалення. Гэта наш стрыжань.

**А. Зельскі:** — Каб мы памяталі пра мінулае, каб не адбылося таго, што назіраем у некаторых краінах, у нас будуюцца і аднаўляюцца помнікі. Пра заходніх суседзяў я і казаць не хачу. Што граху хаваць, і ў нашых усходніх суседзяў назіраюцца некаторыя прабелы ў памяці. Прыязджаюць і здзіўляюцца, што ў Беларусі было гета.

***— Мемарыяльны комплекс «Хатынь» кіраўніком дзяржавы быў аб'яўлены Усебеларускай маладзёжнай будоўляй. На тэрыторыі мемарыяла адбылася маштабная рэканструкцыя. Некаторыя жыхары Беларусі хвалююцца, ці захавае «Хатынь» свой першапачатковы выгляд, а галоўнае, той пасыл, які імкнуліся перадаць аўтары?***

**А. Зельскі:** — Мемарыял захаваўся цалкам, ніхто не збіраўся яго перайначваць. Мемарыяльны комплекс «Хатынь» — помнік гісторыка-культурнай каштоўнасці першай катэгорыі. Гэта застаецца нязменным, таму ніхто не мяняў там ні літары, ні каменя. Рэканструкцыя завершана. Ці будзе там трэцяя чарга, рашэнне прыме Мінскі аблвыканкам. Што датычыцца мемарыяльнага комплексу, то і дах пуні, і пастамент Камінскага, і

сама скульптура — ранейшыя. Усе пліты здымаліся, кожная шліфавалася, трэшчынкі шпакляваліся — у выніку ўсё вярталася на месца. Будаўнікі казалі, што танней было б пакласці ўсё новае, чым рамантаваць... Мемарыял прастаяў больш як 50 гадоў. Бетон ужо быў не той якасці, рассыпаўся зруб, які сімвалізаваў «дрэвы жыцця». Кепска выглядала лічба 186, патрэскаліся ўсе «Могілкі вёсак»... Каб прывесці ўсё ў прыстойны выгляд, была праведзена тытанічная праца. Гэта ж не класічны музей, калі экспазіцыя знаходзіцца пад дахам. Зіма-лета — зямля «дыхае»: усё гэта перакручвае бетонныя канструкцыі. Таму і было прынята рашэнне аднавіць мемарыял максімальна набліжана да таго, як было раней. Праўда, з'явіліся элементы, якіх дагэтуль не было. Перад пастаментам «Няскораны чалавек» паклалі брукаванку. Магу сказаць, што ў 1969 годзе колатага каменя там таксама не было: ляжалі пліты, пасля ўжо дадалі колаты камень. Большая частка яго засталася, але для перамяшчэння інвалідаў, якія ўвесь час скардзіліся, што не могуць даехаць да вечнага агню, з'явілася брукаванка.



**Г. Левіна:** — Для мяне рэканструкцыя «Хатыні» стала пазітыўным момантам, але ў той жа час і трывожным. Гэта акурат той выпадак, які пакажа, як у далейшым — прафесійна ці не — будуць адносіцца да рэстаўрацыі тых ці іншых мемарыялаў, што ўжо створаны. Гэта і Шунеўка, і Трасцянец, і Ала, і Боркі... Магчыма, «Звязда» правядзе наступны круглы стол, на якім можна будзе пагаварыць аб праблемах, якія існавалі пры рэстаўрацыйных работах у Хатыні, на іншых помніках. Мы павінны рыхтаваць людзей, якія б не проста прыехалі і пафарбавалі скульптуру, лаўку ці бардзюр у той ці іншы колер, а такіх спецыялістаў, якія будуць беражліва ставіцца да помнікаў, бо гэта і іх памяць. Мне здаецца, падчас рэканструкцыі «Хатыні» павінна было захавацца больш аўтэнтычных архітэктурных элементаў ці зарадзіцца ідэя — пакінуць квадратны метр колатага каменя, або адну ячэйку, бо гэта рабілі такія ж, як і вы (моладзь. — **«Зв.»**), толькі 50 гадоў таму. І, на мой погляд, гэта павінна захавацца, каб была пераемнасць і ў вывучэнні, і ў дакументаванні нашай гісторыі. Чаму гэта важна? Беларусь, як ні адна краіна, на высокім мастацкім, асэнсавана творчым узроўні расказала аб трагедыі на акупаванай тэрыторыі. Так гаворым не мы — гэта прызнана сусветнай супольнасцю. Мы павінны працягваць гэта рабіць: новыя даныя, у тым ліку вызначаныя Генеральнай пракуратурай падчас расследавання, будуць даваць новыя тэмы для аповеду — а значыць, і мемарыялізацыі.

**А. Зельскі:** — Сярод журналістаў распаўсюджана думка, што «Хатынь» дапамагала будаваць уся краіна ў той перыяд, калі гэта адбывалася. Хачу падкрэсліць, што «Хатынь» стваралася на сродкі БССР. Ніхто не рэкламаваў «Хатынь» як нейкі мемарыял. Безумоўна, нешта прывозілі і з Расіі, Украіны: у нас няма свайго граніту, мармуру. Але гэта ўсё закуплялася за сродкі бюджэту, народа. Як тады гэта быў народны мемарыял, бо ўсё будавалася за народныя грошы, так і сёння, як сказаў Аляксандр Рыгоравіч, усё аднаўляецца за народную капейку. Уся Беларусь аднаўляе Хатынь.



**П. Алекса:** — Кіраўнік дзяржавы падтрымаў ініцыятыву моладзі па аб'яўленні рэканструкцыі мемарыяла Усебеларускай маладзёжнай будоўляй. Працуючы ў Хатыні, моладзь перажывала тыя пачуцці, тыя сэнсы, якія ўвогуле закладваюцца мемарыяльным комплексам. Гэта і ёсць асноўная сутнасць нашай працы. Яна вымяраецца нават не тым аб'ёмам пакладзенай цэглы, а ў гэтай выхаваўчай дзейнасці, што была праведзена з моладдзю. Маладыя людзі працавалі непасрэдна на рэканструкцыі «Могілак вёсак», на будоўлі музея, дзе было задзейнічана звыш паўтары тысячы чалавек. Сярод іх былі і маладыя хлопцы, дзяўчаты з будаўнічых атрадаў з усёй краіны. Таксама ў працоўных акцыях удзельнічалі і студэнты з Расійскай Федэрацыі. Амаль кожны тыдзень у Хатынь выязджала моладзь, у тым ліку ўдзельнічала ў суботніках, іншых акцыях па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Першым там заўсёды быў наш лідар Аляксандр Лук'янаў, які разам з моладдзю браў удзел у гэтай працы. Паклапаціліся мы і пра тое, каб сучаснай моладзі было цікава наведваць Хатынь: у кантэксце праекта БРСМ «Лічбавая зорка» прымацавалі металічную таблічку з QR-кодам, скануючы які можна прачытаць пэўную інфармацыю. Матэрыялы, фотаздымкі адлюстроўваюць, як той ці іншы элемент мемарыяла выглядаў да рэканструкцыі. Безумоўна, самай яркай кропкай у абноўленым мемарыяльным комплексе стане музей.

**А. Зельскі:** — Ідэя старая, не намі прыдуманая. Яшчэ ў 1969 годзе пастановай ЦК КПБ было прынята рашэнне аб пабудове на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу музея. Шмат яшчэ якія аб'екты павінны былі з'явіцца ў Хатыні, але, як гэта часта бывае, нешта пайшло не так: многае адкладалася ў доўгую скрыню, пра што з часам забыліся. Дзякуй Богу, 16 красавіка, падчас рэспубліканскага суботніка, было прынята рашэнне пабудаваць новы музей, экспазіцыя якога памяняе светапогляд любога чалавека, які прыедзе ў Хатынь. Гэта было патрэбна, бо адышлі тыя пакаленні, якія памятаюць мінулыя падзеі, для якіх тая вайна — гэта боль. Для нас з вамі тая вайна — гэта боль, але ўжо для нашых дзяцей, прабачце, не ўпэўнены. Што для нас з вамі сёння значыць вайна 1812 года? А яна, між іншым, забрала кожнага чацвёртага жыхара Беларусі.

**П. Алекса:** — Падзеі ранейшых войнаў не ўспрымаюцца моладдзю, бо няма яркіх прыкладаў. Што датычыцца апошняй вайны, ёсць і прыклады, і помнікі. Аднак ці заўсёды пры аповедзе аб падзеях Вялікай Айчыннай выкарыстоўваюцца тыя формы работы, якія патрабуюць адэкватнага ўспрымання моладдзю? Спадзяёмся, што музей раскажа аб вайне падрастаючаму пакаленню даступна і зразумела.

**Л. Ананіч:** — Хочацца спадзявацца, што ў абноўлены мемарыяльны комплекс «Хатынь» зноў паедуць чароды экскурсій. Калі мы рыхтавалі ў 2021 годзе парламенцкую канферэнцыю па гістарычнай памяці, на вялікі жаль, адчулі: патрэбна ўзмацняць патрыятычнае выхаванне, у тым ліку і праз наведванне мемарыяльных аб'ектаў. Нашы школьнікі не бываюць у мемарыялах і музеях у тым аб'ёме, як хацелася б. Калі дзіця за час навучання ў школе не наведала Брэсцкую крэпасць, Хатынь, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, яно не атрымае тое, што павінен атрымаць кожны грамадзянін сваёй краіны. Калі людзі, адвучыўшыся пяць гадоў у ВНУ, не пабывалі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, то гэта пытанне і да нашых маладзёжных арганізацый. Чаму яны не дастукаліся да гэтага студэнта, які за пяць гадоў не знайшоў дарогу, якую трэба было знайсці?

***— Трагедыя Хатыні і іншых населеных пунктаў — несуцішны боль усіх беларусаў. Без гэтай старонкі гісторыі выхоўваць сучаснае пакаленне проста немагчыма. Як гэта рабіць у сённяшніх рэаліях?***

**Л. Ананіч:** — Гэтую тэму трэба працягваць даследаваць. У тэму Вялікай Айчыннай вайны павінны прыйсці маладыя навукоўцы, якія павінны самі перагарнуць гэтыя старонкі. Калі мы гэты фундаментальны стрыжань, нашу фундаментальную каштоўнасць цяпер не ўмацуем — новымі даследаваннямі, расследаваннем, мемарыяламі, расстаўленнем акцэнтаў і прыцягненнем да адказнасці, — то гэтага ніхто не зробіць да нас. Няхай яны ўжо сышлі, але імёны здраднікаў павінны быць засведчаны ў чорнай кнізе гістарычнай памяці. А ў белай кнізе павінны быць адлюстраваны гераіка і боль — гэта наша святая памяць. І самае важнае, што сёння мы зрабілі тыя крокі, якія ніхто не ажыццявіў на постсавецкай прасторы. У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь мы першыя напісалі аб тым, што дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны (артыкул 15), што захаванне гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа, патрыятызм з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь (артыкул 54). Мы прынялі спецыяльныя законы мемарыяльнага заканадаўства: законы «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму» і «Аб генацыдзе беларускага народа», якія таксама працуюць на справу захавання гістарычнай праўды і памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

**Г. Левіна:** — Памяць — з'ява комплексная. Гэта работа не толькі гісторыкаў, выкладчыкаў, пракуратуры, дзяржавы. У яе фарміраванні задзейнічана ўсё грамадства. І, вядома, вельмі важна, як у гэтай сістэме працуюць прафесійныя гісторыкі, улада, пракуратура, журналісты і архітэктары, творчыя людзі. Бо калі мы гаворым, што мемарыял у Хатыні адкрыў свету, што адбылося на акупаванай тэрыторыі Беларусі, то разумеем, што трэба было знайсці такія словы, каб расказаць аб трагедыі беларускага народа архітэктурай. Цяпер вельмі важна, каб не толькі гісторыкі і супрацоўнікі Генеральнай пракуратуры, якія робяць каласальную работу, а ўся грамадская супольнасць — тыя, хто працуе ў кінематаграфіі, літаратары, у архітэктуры, мастацтве, — разумелі, як важна шукаць словы, кожны ў сваёй галіне, і расказваць аб вайне. Нефармальнымі словамі распавядаць аб гісторыі канкрэтнага месца. Такія персанальныя гісторыі патрэбны і тым, хто жыве ў гэтых населеных пунктах. Яны захоўваюць гэтую памяць, і грамадства павінна дапамагаць ім гэта рабіць.

**А. Літвін:** — Вы звярнулі ўвагу на вельмі важнае пытанне, якое можна назваць культурай гістарычнай памяці. Можа так здарыцца, што мы скіруем усе акцэнты на музей, а патрэбна, каб у кожным раёне ў эпіцэнтры ўвагі знаходзілася свая «міні-Хатынь». Пры гэтым важна выпрацоўваць сучасныя падыходы культуры памяці з улікам таго, што нашы дзеці і ўнукі глядзяць на тыя падзеі зусім па-іншаму. Органы, якія займаюцца выхаваннем моладзі, павінны ўлічваць усе ноу-хау, якія ідуць ад жыцця.

**Л. Ананіч:** — Усё гэта ўжо сёння працуе. Па прапанове Генеральнай пракуратуры ў кожным раёне з'явіліся экспазіцыі па генацыдзе беларускага народа, якія занялі цэнтральнае месца ў музеях. Вядома, ноу-хау маюць значэнне, але ні адзін мультымедыйны кантэнт не заменіць гучанне звана ў Хатыні. Там, у гэтай цішыні, пасярод зімы або падчас асляпляльнага летняга сонца, гэты гук разрывае сэрца. Адначасова чалавек не даедзе ўсюды, але, пабываўшы тут, ён убачыць увесь маштаб трагедыі беларусаў. Мы ведаем, якія моцныя ўражанні пакідае наведванне такіх месцаў. Гэта на ўсё жыццё. Вельмі правільным было рашэнне нашага Прэзідэнта абнавіць мемарыяльны комплекс у Хатыні. Там усё было добра па сутнасці, але час наклаў свой адбітак. Гэта кранальны аб'ект нашай памяці: ты судакранаешся і разумееш, што тут застыла жыццё, тут — вечнасць.

**А. Крыварот:** — Хатынь — гэта вароты, якія адчыніліся ў 1969 годзе ў свет генацыду, які быў на беларускай зямлі. Да 1969-га тыя жахлівыя падзеі пачалі забываць. Таму тое, што цяпер робіць Генеральная пракуратура і гісторыкі (дарэчы, з усіх рэгіёнаў), многае значыць. Трэба звярнуць увагу акурат на тыя населеныя пункты, якія мы адкрылі грамадскасці. Расказваць нават пра хутары. Ёсць выпадкі, калі ў адной хаце спалілі дзясяткі людзей. Правільна была выбрана стратэгія — паказаць усе населеныя пункты, дзе была спалена хоць адна хата, забіты хоць адзін чалавек.

**Л. Ананіч:** — І не толькі ў мультымедыйным варыянце паказаць гэтыя вёскі, а там, дзе ёсць магчымасць, усталяваць помнікі, няхай сціплыя, куды можна пакласці кветкі. Напрыклад, у вёсцы Дунаі Лагойскага раёна, дзе былі спалены мае родныя, знаходзілася толькі іх магіла з помнікам, побач яшчэ ёсць пахаванні — усяго ўвекавечана пяць прозвішчаў. У акце спаленай вёскі — 39. І нідзе не было пазначана, што тут знаходзілася спаленая вёска. Неабходна, каб на ўзроўні раённых выканаўчых камітэтаў паглядзелі на гэтую тэму, каб не абмяжоўваліся толькі стварэннем мультымедыйнай экспазіцыі і электроннай карты знішчаных населеных пунктаў. Устанавіць прыродны камень з шыльдай, якая ўказвае, што тут была спалена вёска, — ужо добра. Гэта не такія вялікія сродкі. І тут павінен быць не толькі клопат дзяржавы, але і ўвага грамадскасці. Трэба, каб было куды прыйсці і пакланіцца святой памяці людзей, бо, на вялікі жаль, пакаленне адыходзіць, і калі мы не будзем ведаць, дзе знаходзілася тая ці іншая вёска, то будзем хадзіць па касцях...

**А. Крыварот:** — І такая праца павінна праводзіцца не толькі ў адносінах да неадноўленых вёсак, але і да тых, якія адрадзіліся. Напрыклад, аб маштабах трагедыі вёскі Дзмітравічы Бярэзінскага раёна, дзе я нарадзіўся, даведаўся зусім нядаўна, калі займаўся даследаваннем архіўных дакументаў. У населеным пункце, які з'яўляецца цэнтрам сельсавета, падчас нямецкай акупацыі было разбурана 70 % дамоў, забіты 32 жыхары.

**С. Шыкунец:** — Дзякуючы дакументам нашы веды аб ваенным перыядзе дапаўняюцца. Да пачатку расследавання гаварылася аб больш як 140 карных аперацыях, якія на нашай тэрыторыі праводзілі нацысты. Цяпер аперыруем лічбай не менш як 220: аб малавядомых акцыях знішчэння мірнага насельніцтва раскажам у нашай трэцяй кнізе «Генацыд беларускага народа. Карныя аперацыі». Першая кніга «Генацыд беларускага народа» агульнага характару, другая — «Генацыд беларускага народа. Лагеры смерці». І тут падобная сітуацыя. Паводле рэспубліканскага даведніка, на тэрыторыі БССР існавала 490 месцаў масавага ўтрымання і знішчэння насельніцтва: гэта лагеры смерці, канцэнтрацыйныя лагеры, працоўныя, гета, лагеры на пярэднім краі абароны і інш. Цяпер мы заяўляем аб звыш 90 новых месцаў прымусовага ўтрымання насельніцтва, якія раней былі невядомыя. Тое, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны загінуў кожны трэці жыхар Беларусі, — гэта ўжо дакладна.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

## Меркаванне

### Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:



— У гісторыі кожнага народа ёсць свае месцы сілы, смутку і памяці. Для беларусаў адным з такіх у XX стагоддзі стала Хатынь. 80 гадоў таму ў беларускай глыбінцы быў на практыцы рэалізаваны акт стварэння «свету, заснаванага на правілах» па еўрапейскіх канонах. 22 сакавіка 1943 года ў Хатыні былі жыўцом спалены 149 жыхароў, з якіх 75 дзеці. Пад выглядам прасоўвання «цывілізацыі» і «парадку» на савецкай тэрыторыі ажыццяўляўся генацыд народа, а жыццё нашых продкаў, «расава непаўнавартасных» па фашысцкай кваліфікацыі, рэальна нічога не каштавала. Лёс Хатыні падзялілі 216 беларускіх населеных пунктаў.

Сёння «цывілізаваны» Захад практычна перапісаў гісторыю, па-майстэрску жаглюючы паняццямі і фактамі адмежаваўся ад цёмнага мінулага, актыўна прасоўваючы ідэю «абароны дэмакратычных каштоўнасцяў». У гэтую канцэпцыю добра ўкладаюцца адраджальныя прынцыпы нацыяналізму, якія робяцца абавязковым атрыбутам сучаснай палітыкі. Спадчыннікі фашыстаў, не саромеючыся, выкарыстоўваюць ідэалагічныя ўстаноўкі сваіх папярэднікаў, трансфармуюць грамадскую і індывідуальную свядомасці, песцяць ідэі ўласнай выключнасці і перавагі, практычна рэалізоўваюць рэваншысцкія праекты. Чарговы раз робяцца спробы пашырэння «жыццёвай прасторы» і «справядлівага пераразмеркавання рэсурсаў». Як і дзесяцігоддзі таму, мірных жыхароў забіваюць «цывілізаваныя» прадстаўнікі Заходняга свету, а на іх уніформе зноў фашысцкая сімволіка. Сёння карычневая чума — гэта не літаратурная алегорыя, а рэальнасць нашага часу.

Беларусь, якая стала арэнай генацыду і страціла кожнага трэцяга ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ніколі не змірыцца з адраджэннем фашызму і яго ідэалогіі ў любых формах. Мільёны мірных жыхароў былі знішчаны гітлераўцамі і іх памагатымі, а дэмаграфічныя страты Беларусі не ўдалося аднавіць да гэтага часу. У нашай краіне няма месца забыццю, блюзнерству і рэвізіі гісторыі. Жыць на сваёй зямлі, абараняць яе і свае ідэалы, гадаваць дзяцей і берагчы гістарычную памяць — запавет продкаў нам, сучаснаму пакаленню. Памятаць і не дапусціць паўтарэння, спыніць фашызм і захаваць сваю ідэнтычнасць заклікаюць нас званы Хатыні.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 31 марта 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-34623**, площадью **35 167,2 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 15. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-15. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340800000003000135** общей площадью **16,3759 га** – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (для размещения объектов промышленности). **Доля права на земельный участок будет выделена после регистрации изолированного помещения № 15.** **В состав лота входит оборудование. ПОЛНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА размещен на сайте Организатора торгов www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»** | **1 254 161,39** | 62 708,07 |

**Продавец:** ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович.

**Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 марта 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 29 марта 2023 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.**

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи с момента подписания договора купли-продажи.

**Предоставляется рассрочка платежа в соответствии с действующим законодательством РБ.** Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «РАЙБЫТУСЛУГИ» г. Калинковичи – в лице ликвидатора извещает о проведении 31 марта 2023 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 40 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 333/D-46321**, площадью **887,9 кв. м**, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – **коммунально-бытовое помещение, находящееся на 1-3-м этажах. Адрес:** Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Фрунзе, 3-1. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **322350100002002684** общей площадью **0,1118 га** – для обслуживания производственного здания со встроенным помещением финансового назначения (для размещения объектов бытового обслуживания населения). **Право постоянного пользования (доля в праве 23/25).** Местоположение: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Фрунзе, 3. **В состав лота входит:** оборудование и инвентарь в количестве 405 ед. **Обременение:** договоры аренды | **559 200,00** | 55 920,00 |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Райбытуслуги» г. Калинковичи. 247710, Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Фрунзе, 3. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 690-00-10 – ликвидатор Беланов Руслан Николаевич.**

**Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 марта 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 29 марта 2023 г. в 16.00 включительно.**

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки, согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 18.11.2022 г. № 227 (29849). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

Центр Промышленной Оценки

- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Агролизинг», 220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31, +37517-242-13-81 |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование (Назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Административное помещение** (Административное помещение) по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 4-1Н | 884 кв. м | 500/D-70779533 |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 963 354,29 доллара США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)** | | | |
| 2 | **Торговое помещение** (Торговое помещение) по адресу: г. Борисов, ул. Строителей, д. 26, пом. 5 | 1672,1 кв. м | 610/D-47661 |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 2 210 476,19 белорусского рубля** | | | |

**Условия по лотам №№ 1–2:** в случае признания победителем аукциона либо единственным участником, согласившимся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на пять процентов, хозяйствующего субъекта, до совершения сделки, может потребоваться согласие антимонопольного органа (Министерства антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь) на экономическую концентрацию

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 30 рабочих дней после проведения аукциона и при необходимости получения согласия антимонопольного органа на экономическую концентрацию

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта такая оплата должна быть произведена **в течение 30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи и при необходимости получения согласия антимонопольного органа на экономическую концентрацию

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.10.2022

**Аукцион состоится 05.04.2023 в 13.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 03.04.2023 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8044-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по жилому дому «Корабль» по г.п. 3.1 в составе объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 2-я очередь строительства. Жилые дома «Корабль» по г. п. №№ 3.1, 3.2, торгово-общественные помещения №№ 5.1, 5.2, 5.3 по г. п.», *опубликованную в газете «Звязда» от 02.07.2022 № 128 (29750)***

**Застройщик:** коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом 05.01.2015 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №192400611.

**Юридический и почтовый адрес:** ул. С. Есенина, 4-107, г. Минск, 220025, Республика Беларусь, тел./факс +375 (17) 234-16-99, тел. +375 (17) 234-16-98.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей предлагаются **20 (двадцать) квартир без машино-мест**.

Стоимость 1 кв. м общей площади – **3 270,00 белорусских рублей.** Условие оплаты – 50 % цены договора в течение 10 (десяти) календарных дней с даты регистрации договора в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – по графику к договору долевого строительства.

При внесении единовременно всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме стоимость 1 кв. м общей площади – **3 150,00 белорусских рублей.**

Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди **с 8.30 24.03.2023** по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).

УНП 192400611

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «ПМК-188» (222357, Минская обл., г. Воложин, ул. Пушкина, 24) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

| № лота | Наименование | Инв. № | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Вагон-дом ВД-2, 1980 г. в. | 8921 | 1 015,00 | 101,00 |
| 2 | Вагон-дом ВД-2, 1980 г. в. | 8922 | 1 728,00 | 172,00 |
| 3 | Вагон-дом на колесном шасси, 1981 г. в. | 18926 | 561,00 | 56,00 |
| 4 | Вагон-дом (кунг) на шасси от автомобильного прицепа 2ПН-2, год выпуска не установлен | 12529 | 1 026,00 | 102,00 |
| 5 | Штукатурная станция ШС-4/6, 2010 г. в. | 12486 | 10 368,00 | 1 036,00 |
| 6 | Прицеп тракторный самосвальный 2ПТС-4,5, год выпуска не установлен, регистрационный знак ОК-5 6867 | 137 | 1 296,00 | 129,00 |
| 7 | Прицеп-самосвал автомобильный МАЗ-857100, 2010 г. в., регистрационный знак А 9318 А-5, рама № Y3M857100A0006820, цвет светло-серый | 116798 | 3 672,00 | 367,00 |
| 8 | Прицеп-самосвал автомобильный МАЗ-857100-010, 2008 г. в., регистрационный знак отсутствует, рама № Y3M85710080000453 | 116738 | 2 700,00 | 270,00 |
| 9 | Бункер БН-1,0 СТШИ.Б-0,38.000, 2014 г. в. | 116859 | 982,00 | 98,00 |
| 10 | Бункер БН-1,0 СТШИ.Б-0,38.000, 2014 г. в. | 12557 | 864,00 | 86,00 |
| 11 | Прицеп-самосвал автомобильный МАЗ-857100-010, год выпуска не установлен, регистрационный знак отсутствует, № рамы не установлен | 12605 | 3 240,00 | 324,00 |
| 12 | Штукатурная станция СШВ-4, 2010 г. в., на шасси прицепа ПТ-7 | 116788 | 11 016,00 | 1 101,00 |
| 13 | Автомобиль легковой седан ВАЗ-21074, 2008 г. в., регистрационный знак 7386 ЕР-5, кузов № XTA21074082734306, цвет сине-зеленый | 116775 | 961,00 | 96,00 |
| 14 | Автобус Mercedes-Benz 310 KB, год выпуска не установлен, регистрационный знак АО 5874-5, кузов № WDB6020771P290629, цвет бело-зеленый | 12575 | 3 348,00 | 334,00 |

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Воложин, ул. Пушкина, 24.

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

*Начальная цена лотов снижена на 10 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB 30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не установлено договором купли-продажи.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

**Условия аукциона:** работоспособность узлов и агрегатов не проверялась, при инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества.

Аукцион состоится **29.03.2023 в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.03.2023** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.**

УНП 600019633

# Фларысты і спецыялісты па інфармацыйнай бяспецы



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## НОВЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ

Конкурсы прафесійнага майстэрства праводзяцца не толькі дзеля таго, каб вызначыць пераможцаў. Гэта яшчэ і магутнае прафарыентацыйнае мерапрыемства. Дарэчы, менавіта ў рамках гэтага конкурсу нарадзілася і новая спецыяльнасць «Фларыстычны дызайн». Такая кампетэнцыя была прадстаўлена яшчэ на першых конкурсах, але толькі сёлета ў Мінскім дзяржаўным каледжы рамесніцтва і дызайну імя М. Кедышкі распачнецца падрыхтоўка фларыстаў.

— «Фларыстычны дызайн» — абсалютна новая прафесія ў нашай краіне. Адкрыта яна дзякуючы актыўнай рабоце творчай групы



пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі і асноўных арганізацый — заказчыкаў кадраў: гэта Мінскі парнікова-цяплічны камбінат, Галоўнае гаспадарчае ўпраўленне Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і «Ружа.Бел», — расказала **дырэктар каледжа Ганна БОЙКА.** — Набіраць на гэты кірунак мы будзем як на ўзровень прафесійна-тэхнічнай, так і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У першым выпадку рыхтуем фларыстаў чацвёртага разраду, у другім — пятага. Абітурыентам, якія паступаюць на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі, здаваць нічога не трэба. Да ўвагі бярэцца толькі сярэдні бал дакумента аб адукацыі.

— Калі ж малады чалавек першапачаткова жадае атрымаць больш высокую кваліфікацыю і мае намер падаваць дакументы на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі, то яму, акрамя прад'яўлення атэстата, трэба будзе вытрымаць яшчэ і творчы экзамен. Цяпер на зацвярджэнні знаходзіцца праграма ўступнага іспыту: гэта будзе фармальная кампазіцыя з пяці аб'ёмных геаметрычных фігур, — праінфармавала Ганна Бойка і патлумачыла, чым жа адрозніваюцца паміж сабой фларысты розных разрадаў. — Спецыяліст чацвёртага разраду ўмее вырабляць круглыя, каскадныя, сіметрычныя букеты з жывых зрэзаных кветак і іншага расліннага матэрыялу ў спіральнай і паралельнай тэхніцы, кветкавыя кампазіцыі на фларыстычнай губцы.

Фларыст пятага разраду будзе ствараць дэкаратыўныя структурныя букеты з жывых зрэзаных кветак, сухацветаў, штучных кветак і іншага расліннага матэрыялу нестандартных форм, з вялікай колькасцю зеляніны і дэкаратыўных элементаў са штучных і натуральных матэрыялаў, кветкавыя кампазіцыі нестандартных форм з жывых зрэзаных кветак, сухацветаў штучных кветак, аксесуары рознага роду. Акрамя таго, падчас вучобы юнакі і дзяўчаты змогуць паралельна асвоіць прафесіі кантралёра-касіра і кветкавода.

Таксама наш каледж упершыню будзе ажыццяўляць набор па спецыяльнасці «Абслугоўвая праца. Выяўленчая творчасць». Гэты кірунак навучання прыцягальны для дзяўчат — будучых настаўніц працы і малявання ў пачатковых класах. Мы даследавалі рынак працы — патрэба ў такіх кадрах ёсць з боку ўпраўленняў па адукацыі», — запэўніла Ганна Бойка.

## ПА КОНКУРСЕ АТЭСТАТАЎ

Усяго ў прафесійныя каледжы плануюць прыняць сёлета больш за 65 тысяч абітурыентаў.

— Усе навучальныя ўстановы, якія рэалізоўваюць праграмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, перайшлі на адзіны від установы адукацыі — цяпер гэта каледж, — патлумачыла Аляксандра Пятрова. — Сёння ў краіне іх налічваецца 229. Акрамя таго, быў уведзены новы класіфікатар спецыяльнасцяў і кваліфікацый. Гэта важны фундаментальны дакумент, у якім перагледжаны найменні спецыяльнасцяў, унесены новыя, а нейкія страцілі сваю актуальнасць і былі выключаны.

Што датычыцца правілаў прыёму, то ў сёлетнюю ўступную кампанію выпускнікі 9 і 11 класаў будуць залічвацца па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб адукацыі. Раней, нагадаем, адзінаццацікласнікі здавалі ЦТ.

— Праўда, змены не закрануць творчыя спецыяльнасці, а таксама прафесіі, звязаныя з фізічнай культурай і спортам. У такіх выпадках (акрамя сярэдняга бала атэстата) абітурыенты па-ранейшаму будуць здаваць і ўступныя іспыты. Гэта спецыфіка адбору таленавітых дзяцей, — удакладніла Аляксандра Пятрова.

Прыём дакументаў у каледжы на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі стартуе 15 чэрвеня і завершыцца 23 жніўня. Калі застануцца вакантныя месцы, залічэнне можа быць працягнута да 15 верасня. Усяго на гэты ўзровень плануецца прыняць больш як 26 тысяч абітурыентаў. А на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі план прыёму складае больш за 39 тысяч чалавек, з іх больш за 27 тысяч будуць навучацца за кошт бюджэтных сродкаў.

Як заўважыла спецыяліст, пералік спецыяльнасцяў у каледжах пераглядаецца штогод. Набор па нейкіх закрываюць ці, наадварот, аднаўляюць. Гэта звязана з бягучай патрэбай у рэгіёнах базавых прадпрыемстваў у канкрэтных кадрах. Таму ў 2023 годзе на ўзроўні ПТА плануецца спыніць набор па 142 прафесіях і адкрыць па 136. Абсалютна новыя прафесіі, па якіх падрыхтоўка ў краіне будзе весціся ўпершыню, таксама з'явяцца. Акрамя ўжо згаданага вышэй «Фларыстычнага дызайну» на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі распачнецца навучанне па прафесіях «Распрацоўка і суправаджэнне вэб-рэсурсаў», «Фізіка-хімічны аналіз прадуктаў вытворчасці», «Будаўніцтва і эксплуатацыя энергаэфектыўных будынкаў і збудаванняў», «Выраб аптычных прыбораў».

## ПАД ПАТРЭБЫ ЗАКАЗЧЫКАЎ

У філіяле БДУІР «Мінскі радыётэхнічны каледж» упершыню ў краіне на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі адкрыецца спецыяльнасць «Тэхнічнае забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі» з атрыманнем кваліфікацыі «Тэхнік па інфармацыйнай бяспецы».

— Гэта вельмі актуальны напрамак, бо мы жывём у лічбавым свеце, усе прадпрыемствы пераходзяць да канцэпцыі «Індустрыя 4.0», — расказала **дырэктар каледжа Вікторыя ШАТАЛАВА.** — Спецыяліст па інфармацыйнай бяспецы — адна з ключавых прафесій, запатрабаваных на рынку працы, бо амаль кожная арганізацыя сёння сутыкаецца з праблемай інфармацыйных пагроз і, як вынік, задачай гарантавання бяспекі даных. Пастаянна ўдасканальваюцца



тэхналогіі абароны баз даных, але ўразлівасць абароны не толькі не памяншаецца, а ўвесь час расце. Выпускнікі гэтай спецыяльнасці будуць ажыццяўляць маніторынг сістэмы інфармацыйнай бяспекі, настройку і абслугоўванне тэхнічных і праграмных сродкаў абароны, ажыццяўляць пошук магчымых каналаў уцечак даных, устаноўку, настройку і абслугоўванне тэхнічных і праграмна-апаратных сродкаў абароны інфармацыі. Спектр прадпрыемстваў, якія выказалі зацікаўленасць у выпускніках гэтай спецыяльнасці, дастаткова шырокі — ад банкаў да кампаній-рэзідэнтаў ПВТ, бо сёння любая арганізацыя сутыкаецца з праблемай інфармацыйных пагроз, таму спецыяльнасць надзвычай запатрабаваная. Раней атрымаць яе можна было толькі на ўзроўні вышэйшай адукацыі, але ўзнікла патрэба адкрыць падрыхтоўку і на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Вікторыя Шаталава паведаміла, што на фоне бурнага развіцця ў краіне мікраэлектронікі ААТ «Інтэграл» — кіруючая кампанія холдынга выказала зацікаўленасць у заказе большай колькасці спецыялістаў для мікраэлектроннай прамысловасці, таму на спецыяльнасць «Вытворчасць вырабаў мікра- і нанаэлектронікі» ў бягучым годзе будзе павялічаны набор. Прычым на «Інтэграле» зацікаўлены менавіта ў мэтавай падрыхтоўцы па гэтай спецыяльнасці, каб гарантавана атрымаць праз некалькі гадоў патрэбных спецыялістаў.

Таксама дырэктар каледжа звярнула ўвагу, што ў 2023 годзе будзе праводзіцца набор на базе 11 класаў на дыстанцыйную форму навучання па спецыяльнасці «Распрацоўка і суправаджэнне праграмнага забеспячэння інфармацыйных сістэм». Дыстанцыйная форма навучання была замацаваная ў новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі.

У Індустрыяльна-педагагічным каледжы РІПА таксама адкрываецца новая спецыяльнасць «Будаўніцтва і эксплуатацыя энергаэфектыўных будынкаў». Набор будзе весціся на аснове базавай адукацыі, а тэрмін навучання складзе 3 гады 10 месяцаў.

У Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным каледжы адкрываецца спецыяльнасць «Распрацоўка і суправаджэнне вэб-рэсурсаў» з прысваеннем кваліфікацыі «Тэхнік-праграміст». Дарэчы, гэта адзіная ўстанова ў краіне, дзе вядзецца падрыхтоўка па такіх рабочых прафесіях, як «Ювелір» і «Майстар ручнога ткацтва».

## ПОПЫТ І ПРАПАНОВА

У Гродзенскім дзяржаўным электратэхнічным каледжы адна з апошніх спецыяльнасцяў, якая тут адкрылася, — «Электроніка механічных транспартных сродкаў» (згодна з новым класіфікатарам, яна будзе называцца «Тэхнічнае абслугоўванне электронных сістэм транспартных сродкаў»). Як расказаў **дырэктар каледжа Алег РАХУНАК,** унікальнасць гэтай спецыяльнасці ў тым, што яна запатрабавана амаль ва ўсіх галінах эканомікі: «Калі мы вывучалі патрэбу ў адпаведных спецыялістах, то пачыналі з сельскай гаспадаркі. Трэба разумець, што цяпер уся сельскагаспадарчая тэхніка кіруецца электронікай. Штогод конкурс на гэту спецыяльнасць даходзіць у нас да трох чалавек на месца. Мы камплектуем як бюджэтныя, так і платныя месцы. Імкнёмся арганізаваць сваю работу так, каб навучанне было апераджальным. Па-першае, гэта цікава моладзі, а па-другое, запатрабавана прадпрыемствамі. Таксама лічым, што трэба даць больш кампетэнцый нашым выпускнікам, таму, напрыклад, слесары па рамонце аўтамабіляў асвойваюць яшчэ і прафесію электразваршчыка ручной зваркі, бо часта акрамя рамонтных патрабуюцца яшчэ і кузаўныя работы. Такая інтэграцыя вельмі апраўданая...»

Увогуле, патрэба ў прадстаўніках рабочых прафесій і спецыялістах сярэдняга звяна пастаянна нарастае. Попыт на выпускнікоў каледжаў на рынку працы значна перавышае прапанову. Таму будзе далей пашырацца мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў. Аляксандра Пятрова патлумачыла яе перавагі:

— Выпускнік школы заключае дагавор і з установай адукацыі, і з прадпрыемствам. Гэта значыць, што малады чалавек ад пачатку разумее, дзе пасля вучобы будзе працаваць і ў якіх умовах. Ён зможа прайсці практыку ў гэтай арганізацыі, якая, у сваю чаргу, будзе суправаджаць свайго будучага работніка, арыентаваць яго па тэматыцы курсавых, гэта значыць, будзе рыхтаваць спецыяліста пад сваю спецыфіку. Таксама некаторыя заказчыкі кадраў выплачваюць навучэнцам, якія заключылі з імі дагавор, дадатковую стыпендыю.

— Кожны год мы ўдасканальваем формы прафарыентацыйнай работы. Сёлета сталі арганізоўваць кірмашы мэтавай падрыхтоўкі, дзе абітурыенты і работадаўцы могуць сустрэцца і знайсці адзін аднаго, — дадала Аляксандра Пятрова. — У Мінску такі гарадскі кірмаш праходзіў на базе Палаца чыгуначнікаў. Таксама ў нас з'явілася анлайн-платформа прафарыентацыйнай падтрымкі «ПрофіТэст», створаная ў Рэспубліканскім інстытуце прафесійнай адукацыі. Яе мэта — дапамагчы навучэнцам у выбары прафесіі на аснове вывучэння іх індывідуальных здольнасцяў, схільнасцяў і інтарэсаў. Магчымасці «ПрофіТэста» дапамагаюць правесці комплексную дыягностыку і выбраць не толькі прафесію, але і канкрэтную ўстанову адукацыі, дзе абітурыент яе атрымае. Гэта можа быць узровень прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі.

«Сёння ў сістэме адукацыі няма тупіковых траекторый для моладзі, — падкрэсліла Аляксандра Пятрова. — Калі сям'я стаіць перад выбарам, ці варта ісці дзіцяці пасля дзевяці класаў у сістэму прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі, то хачу запэўніць, што пасля завяршэння навучання перад выпускніком адкрыты ўсе дарогі для прырошчвання сваіх кампетэнцый. Выпускнікі 11-х класаў усяго пасля аднаго года навучання ў ПТВ могуць прэтэндаваць на скарочанае навучанне на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі. А далей для іх адкрыты спектр адпаведных спецыяльнасцяў у ВНУ, дзе можна навучацца ў вочнай і завочнай форме».

Надзея НІКАЛАЕВА.

# ЧАТЫРОХЛАПЫЯ БАЙЦЫ

**Сёння ў краіне адзначаецца Дзень унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Гэта свята тых, хто стаіць на варце грамадскай бяспекі — адважных і гатовых бездакорна служыць радзіме і людзям. У адну нагу з ваеннаслужачымі насустрач праблемам і здарэнням крочаць не менш адважныя чатырохлапыя байцы — сабакі. Напярэдадні прафесійнага свята карэспандэнт «Звязды» завітала ў сёмую асобную спецыяльную міліцэйскую брыгаду ўнутраных войскаў МУС РБ і даведалася, як нясуць службу надзейныя сябры чалавека.**



Старшы інструктар Валерый МАРЦІНКЕВІЧ і Дана.

Вайсковая часць 5524 сёлета адзначае 30-гадовы юбілей: сваю гісторыю злучэнне вядзе з 1 лістапада 1993 года, калі загадам міністра ўнутраных спраў на базе 17-й роты па канваіраванні в/ч 6713 у Віцебску быў сфарміраваны другі асобны спецыяльны міліцэйскі батальён. У 2013 годзе на яго базе была створана 7-я асобная спецыяльная міліцэйская брыгада. Сёння пад пільнай увагай абаронцаў знаходзіцца ўвесь паўночны рэгіён, а горад Віцебск, амаль у цэнтры якога і размяшчаецца часць, — пад двайным кантролем.

Ваеннаслужачыя забяспечваюць ахову грамадскага парадку; канваіруюць асуджаных і асоб, якія знаходзяцца пад вартай і ажыццяўляюць нагляд; абясшкоджваюць і знішчаюць неразарваныя снарады часоў Вялікай Айчыннай вайны; аператыўна рэагуюць на паведамленні аб мініраванні.

Чатыры лапы, вільготны нос і разумны позірк — крочыць службовы сабака, які заступіў у нарад. Ён возьме след, дзе следу няма, ён не баіцца зла: пагоня, бойка, пісталет — звычайная справа. Жывое «сэрца» брыгады — кіналагічная служба. Сёння яе выхаванцамі з'яўляюцца больш за 100 сабак, сярод якіх — не толькі нямецкія аўчаркі, але і кокеры-спаніэлі, малінуа, лабрадоры. Кожная з парод спецыялізуецца на асобных відах работ: кокеры ўваходзяць у склад сапёрна-піратэхнічных груп, добра шукаюць наркатычныя рэчывы. Аўчаркі задзейнічаны ў канваіраванні, затрымцы небяспечных злачынцаў, ахове грамадскага парадку падчас правядзення масавых мерапрыемстваў.

З унутранай кухняй «сабачага жыцця» мяне знаёміў **начальнік групы спецыялістаў-кінолагаў Дзмітрый ГАРБАЦЭВІЧ.** Праходзім уздоўж так званага «інтэрната»: у кожнага сабакі свой пакой з пляцоўкай для выгулу і камфортнай будкай. Але пагладзіць на першы погляд ласкавых жывёл не даводзіцца: рэагуюць на журналіста гучным брэхам. Яно і правільна: служба ёсць служба. «Шчанюкоў мы атрымліваем у магілёўскім цэнтры падрыхтоўкі, але ў кожнага сабакі павінен быць адзін гаспадар з маленства да самай старасці. Таму часта нашы кінолагі шукаюць сабе выхаванцаў самі: вопытны спецыяліст з першага погляду можа заўважыць разумнага сабаку. Аптымальны ўзрост, калі шчанюка можна браць на выхаванне, — 3 месяцы, потым паўгода ён асвойвае базавыя каманды. Пасля кінолаг разам з гадаванцам праходзяць трохмесячныя курсы падрыхтоўкі, дзе сабака здае прафесійны экзамен, атрымлівае так званы «дыплом» і афіцыйна заступае на службу», — расказвае Дзмітрый.

Некаторыя з чатырохлапых байцоў, якія афармлены як асабістыя, разам з «бацькамі-кінолагамі» пасля дзяжурства ідуць дадому, некаторыя — увесь час жывуць на базе вайсковай часці, атрымліваюць забеспячэнне — якасны збалансаваны сухі корм (ад пярловай кашы тут адышлі даўно). У раскладзе аднаго сабакі — восем дрэсіровак па дзве гадзіны на месяц. Астатні час у кінолагаў займае догляд падапечнага, рэгулярная ваенная падрыхтоўка, бо гэта спецыяльнасць не толькі пра выхаванне, але і пра навыкі стральбы, абароны.

Як жа сабакі адрозніваюць наркотыкі ад іншых рэчываў або адчуваюць пад зямлёй снарад? «Мне як кінолагу з 20-гадовым стажам прынцып навучання зразумелы. Раскажу і вам, — пачынае дзяліцца сакрэтамі дрэсіроўкі начальнік групы спецыялістаў-кінолагаў. — Спачатку гэта гульня, калі шчанюк шукае нешта смачнае. Потым ласунак хаваюць у розных каробках, і сабака павінен абраць патрэбную. А пасля побач са знаёмым смачным кладуць паханосьбіт — ватны дыск, прамочаны наркотыкам. Для чалавека ўлавіць гэты тонкі пах цяжка, для сабакі з абвостраным нюхам — лёгка. Тое ж самае і з пошукам выбуховак — яны адчуваюць пах траціла і пораху. Дарэчы, тых, хто спецыялізуецца на пошуку мін і снарадаў, адвучваюць ад капання зямлі ў мэтах бяспекі».




На варце бяспекі — начальнік групы спецыялістаў-кінолагаў Дзмітрый ГАРБАЦЭВІЧ і Ачар.

Цікава, што першымі наведвальнікамі хакейных і футбольных матчаў, буйных масавых мерапрыемстваў з'яўляюцца таксама сабакі. Вось і падчас нашай сустрэчы спецыялісты з вернымі памочнікамі выправіліся на праверку Палаца спорту перад баталіяй на лёдзе. Выбуховых прылад не выяўлена, можна гуляць спакойна.

Такія розныя па знешнім выглядзе і характарах, але аднолькава паслухмяныя побач з гаспадарамі, яны імкнуцца ў любую вольную хвіліну выказаць сваю любоў: лізнуць языком шчаку ці проста ветліва памахаць хвастом. Бельгійская аўчарка Ачар, які нясе службу ўсяго паўгода, адрозніваецца суровасцю і строгім позіркам, а вось рыжая кокер-спаніэль Дана вельмі гарэзлівая і ласкавая, любіць спяваць па-свойму, па-сабачаму, і гэта не жарты: я паспрабавала ўспомніць адзін знаёмы матыў, і Дана ідэю падтрымала, зацягнуўшы працяжнае «у-у-у». Рына пароды малінуа ўмее лічыць: калі кінолаг спытае: «Колькі будзе 1+1?», яна беспамылкова гаўкне два разы. Вось такія яны — надзейныя сябры чалавека!

Тэрмін выхаду на «пенсію» для сабак вызначаецца па іх рэакцыі, хуткасці, фізічнай форме. У сярэднім гэта дзевяць гадоў, а пасля ім шукаюць новую сям'ю, дзе маленькі баец дажывае свой век у спакоі. «Распаўсюджанае меркаванне аб тым, што ўсіх сабак, якія больш не могуць несці службу, усыпляюць, — гэта міф. Ні адзін кінолаг не адвядзе свайго таварыша, якога песціў і выхоўваў на працягу доўгіх гадоў, у ветклініку проста так», — адзначае Дзмітрый.

У вайсковай часці 5524 кінолагі — гэта ваеннаслужачыя з багатым прафесійным вопытам: былыя пагранічнікі, выпускнікі кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл. А таму, хто вельмі хоча працаваць з сабакамі, можна атрымаць кваліфікацыю на спецыяльных курсах, здаць неабходныя экзамены і стаць на абарону краіны.

«Што, на ваш погляд, галоўнае ў рабоце кінолага?» — пытаюся ў Дзмітрыя Гарбацэвіча на развітанне. «Не здрадзіць чатырохлапаму сябру. Менавіта ён закрывае цябе сабой на заданні. Нездарма кажуць: сабака для нас — яркая старонка жыцця, а мы для яго — цэлае жыццё».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**

Не сезон

# АБ ЗАБАРОНАХ І АБМЕЖАВАННЯХ У ПЕРЫЯД НЕРАСТУ

**Нераст — адно з найбольш важных звёнаў у жыццёвым цыкле рыбы. Большасць відаў рыб, якія жывуць у вадаёмах і вадацёках Беларусі, адносіцца да вясенне-нераставых. У гэты перыяд неабходныя дадатковыя ахоўныя мерапрыемствы, якія забяспечваюць магчымасць рыбе даць шматлікае і жыццеўстойлівае патомства. Пра гэта нагадвае Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету.**



У адпаведнасці з Правіламі з 20 сакавіка па 18 мая ў рыбалоўных угоддзях Брэсцкай і Гомельскай абласцей, з 1 красавіка да 30 мая ў рыбалоўных угоддзях Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай абласцей, а таксама ў Мінску, з 10 красавіка да 8 чэрвеня ў рыбалоўных угоддзях Віцебскай вобласці аматарскае рыбалоўства дазваляецца толькі адной вудай з адным кручком або адным спінінгам, аснашчаным адной штучнай прынадай, якая мае не больш як два адзінарныя, або двайныя, або трайныя кручкі, у светлы час сутак з берага (без заходу ў ваду), а таксама з лёду або штучных збудаванняў, у адносінах да якіх не ўстаноўлены абмежаванні і забароны на гаспадарчую дзейнасць.

Рыбаловам дазваляецца выкарыстанне падхватніка для пад'ёму з вады рыбы, вылаўленай вудай або спінінгам.

Прамысловае рыбалоўства ў дадзеныя перыяды Правіламі забараняецца.

Выкарыстанне ў гэты час любых іншых прылад або спосабаў лоўлі з'яўляецца парушэннем Правілаў і кваліфікуецца па першай частцы артыкула 16.25 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях «Здабыча рыбы або іншых водных жывёл без належнага на тое дазволу, або ў забаронены час і тэрміны, або ў забароненых месцах, або забароненымі прыладамі, або забароненымі спосабамі, а таксама спроба такой здабычы» і цягне накладанне на грамадзян штрафу ў памеры ад 10 да 30 базавых велічынь.

Пры незаконным выманні рыбы ў перыяды забароны шкода, прычыненая навакольнаму асяроддзю, кампенсуецца па падставе таксаў, устаноўленых пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11.04.2022 № 219, у трайным памеры па кожным вылаўленым відзе рыбы.

У гэтыя ж перыяды Правіламі забараняецца выкарыстанне грамадзянамі суднаў. Указанае парушэнне Правілаў кваліфікуецца па чацвёртай частцы вышэйназванага артыкула КаАП Рэспублікі Беларусь і цягне накладанне штрафу ў памеры да 10 базавых велічынь. Выкарыстанне суднаў у перыяды забароны дапускаецца толькі па падставе дазволу, прынятага раённым або гарадскім выканаўчым камітэтам, у выпадках неабходнасці іх выкарыстання для перамяшчэння па водным аб'екце ў гаспадарчых, транспартных, спартыўных і турыстычных мэтах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КІПЕЖ У КІПАХ



## Чаму Ізраіль накрыла «цунамі» пратэстаў?

**Па ўсім Ізраілі ў мінулыя выходныя прайшлі найбуйнейшыя за гісторыю пратэсты, выкліканыя рашэннем урада Біньяміна Нетаньяху рэфармаваць судовую сістэму. Як паведаміла газета Haaretz са спасылкай на арганізатараў дэманстрацый, усяго ў акцыі тыдзень таму ўзялі ўдзел рэкордныя 500 тысяч чалавек (пры насельніцтве каля 9,5 мільёна чалавек). У ізраільскай сталіцы Тэль-Авіве на вуліцу выйшла каля чвэрці мільёна пратэстоўцаў. «Я тут, каб пратэставаць супраць рэформы ў законе і пратэставаць супраць нашага прэм'ер-міністра, якога мы называем «міністрам па справах злачыннасці», — цытуе Reuters словы адной з пратэстоўцаў. Масавыя акцыі наладзілі ў тым ліку і ў паўднёваізраільскім горадзе Беэр-Шэва, які лічыцца апорай кіручай партыі «Лікуд». Акцыі працягваюцца і на гэтым тыдні, прычым адзначаюцца напады на іх удзельнікаў. Так, паведамляецца, што ў Гіватаіме аб галаву аднаго з пратэстоўцаў разбілі бутэльку, пасля чаго ў групу дэманстрантаў заехала машына. У Тэль-Авіве пратэстоўцы перакрывалі дарогі ў цэнтры горада, у раёне плошчы Габіма і з'ездаў на шашу Аялон. Як адзначаюць эксперты, мяркуючы па дынаміцы акцый, яны будуць разгортвацца шырэй. Чаму Ізраіль накрыла «цунамі» пратэстаў, што чакаць надалей?**

### На краі абрыву

У Ізраілі трэці месяц праходзяць масавыя маніфестацыі супраць судовай рэформы, якая дазволіць парламенту прымаць законы без уліку меркавання Вярхоўнага суда. Практычна ва ўсіх гарадах краіны тысячы людзей перакрываюць перакрыжаванні, фермеры з кібуцаў блакіруюць трасы трактарамі. Сапраўдны «кіпеж у кіпах» — натоўпы ў нацыянальных галаўных уборах. Улады прымянілі сілу супраць незадаволеных, ёсць параненыя і затрыманыя. Але, нягледзячы на дэманстрацыі, урад прэм'ера Біньяміна Нетаньяху працягвае прасоўваць законапраект, які зацвердзіць уладу кнесета над судом.

Нагадаем, што ў Ізраілі няма адзінай канстытуцыі, а таму няма і канстытуцыйнага суда. За выкананнем законаў дзяржаўнымі органамі сочыць Вярхоўны суд. І калі спачатку ён разглядаў выключна скаргі грамадзян, звязаныя з парушэннем іх правоў і свабод, то з часам стаў разбіраць іскі аб адпаведнасці прынятых парламентам (кнесетам) рашэнняў асноўным законам. Такім чынам, паступова ператварыўся ў орган канстытуцыйнага нагляду. У выніку гэта прывяло да таго, што рашэнні ўрада кантралююцца Вярхоўным судом, які можа іх адмяніць.

Як вядома, напрыканцы снежня мінулага года да ўлады ў Ізраілі прыйшоў урад на чале з Біньямінам Нетаньяху, які анансаваў новыя рэформы, у тым ліку ў судовай сістэме. Згодна з рэформамі, парламенцкая большасць павінна атрымаць кантроль над выбарам суддзяў Вярхоўнага суда, які пазбавіцца магчымасці прызнаваць несапраўднымі прынятыя ізраільскім парламентам законы. У сярэдзіне лютага закон аб судовай рэформе прайшоў першае чытанне ў парламенце, а 12 сакавіка парламентарыі пачалі падрыхтоўку да другога і трэцяга (канчатковага) чытанняў.

Нетаньяху сцвярджае, што рэформа накіравана на тое, каб перашкодзіць суддзям злоўжываць сваімі паўнамоцтвамі. Праціўнікі рэформы лічаць, што яна знішчыць незалежнасць судовай сістэмы. Прэзідэнт Ізраіля Іцхак Герцаг таксама выступае супраць рэформы. 9 сакавіка ў звароце да нацыі ён назваў законапраект «кашмарным» і «рэпрэсіўным», паколькі той «падрывае дэмакратычныя асновы» краіны, а таксама заклікаў улады адмовіцца ад рэформы.

Пры гэтым Герцаг дадаў, што кіручай кааліцыі і апазіцыі варта паставіць інтарэсы Ізраіля вышэй за палітычнае супрацьстаянне, каб не даць краіне «зваліцца з краю абрыву». Акрамя таго, ён заявіў, што апошнія тры месяцы, на працягу якіх ідуць пратэсты, ён працаваў над кампрамісным варыянтам рэформы і абмяркоўваў іх з прадстаўнікамі ўсіх ідэалагічных спектраў краіны. «Па большасці пытанняў дасягнута згода», — адзначаў прэзідэнт.



### Найвялікшы крызіс

Сутнасць рэформы ў тым, каб пазбавіць судовую ўладу магчымасці ўплываць на рашэнні заканадаўчых і выканаўчых інстанцый. Да гэтага часу Вярхоўны суд мог блакаваць прынятыя законы, якія лічыў неканстытуцыйнымі. Прапанаваныя папраўкі маюць на ўвазе, што любое вета можна будзе пераадолець простай парламенцкай большасцю ў 61 голас. Іншымі словамі, кіручая кааліцыя, якая якраз і мае большасць крэслаў у кнесеце, зможа заўсёды абыходзіць вета Вярхоўнага суда, беспрашкодна прымаць або адмяняць любыя законы.

Ізраільскі журналіст Павел Вігдорчык распавёў, што сапернікі рэформы расцэньваюць яе хутчэй як пераварот. Калі яна будзе ўвасоблена ў жыццё, урад атрымае ўладу над Вярхоўным судом, і такім чынам будзе разбурана сістэма стрымак і процівag, а дзейны ўрад і кааліцыя, якая мае большасць у парламенце, застануцца без усялякага кантролю.

Лідар ізраільскай апазіцыі і колішні прэм'ер-міністр Яір Лапід адзначыў, што Ізраіль «перажывае найвялікшы крызіс у сваёй гісторыі». «Нас накрыла хваля тэрору, разбураецца наша эканоміка, грошы выцякаюць з краіны. Але ўсё, чым заняты ўрад, — гэта знішчэнне нашай дэмакратыі», — заявіў Яір Лапід, выступаючы перад пратэстоўцамі ў Беэр-Шэве, на поўдні краіны. Дэпутаты ад апазіцыі 1 сакавіка байкатавалі галасаванне па законапраекце і далучыліся да ўдзельнікаў пратэснай акцыі. «Няма ніякага сэнсу ў нашым удзеле ў цыркавым прадстаўленні, якое зладзіў тут кіраўнік камісіі Сімха Ротман, — сказаў дэпутат кнесета Ёаў Сегаловіч ад апазіцыйнай партыі «Еш Атыд».

У сувязі з пратэстамі прэм'ер Нетаньяху выступіў са спецыяльнай заявай для СМІ і абвінаваціў ва ўсім кіраўніка апазіцыі Яіра Лапіда, паведаміла news.ru. «Я бачу, што сёй-той зацікаўлены ў анархіі, — сказаў кіраўнік урада. — Гэтага чалавека завуць Яір Лапід. Ён не жадае кампрамісу і абвяргае ўсе заклікі да дыялогу». Лапід неадкладна ў адказ на выпад дзейнага прэм'ер-міністра напісаў у «Твітэры»: «Спадар Нетаньяху, калі нешта і правакуе анархію, то гэта ваш урад, над якім вы страцілі кантроль. Той, хто дазволіў [кіраўніку нацбяспекі] Бэн-Гвіру гуляць з узрыўчаткай, ведаў, што справа скончыцца выбухам».

Пакуль прэм'ер і лідар апазіцыі лаюцца ў сацсетках, урад усяляк дэманструе, што не гатовы адыходзіць ад сваіх намераў. «Тыя ж людзі, якія ў мінулым пратэставалі супраць распрацовак газавых радовішчаў і супраць вакцынацыі падчас эпідэміі каранавіруса, пратэстуюць і цяпер, — заяўляў раней Нетаньяху на пасяджэнні ўрада з нагоды акцый пратэсту супраць юрыдычнай рэформы. — Раней незадаволеныя пагадненнем аб распрацоўцы газавых радовішчаў сцвярджалі, што яно нанясе шкоду эканоміцы, а зараз кажуць, што шкоду ёй нанясе рэформа. Трэба даць адпор гэтай хлусні». Як растлумачыў прэм'ер-міністр пазней, пад адпорам меўся на ўвазе ўдар па лжывых довадах тых, хто спрабуе сеяць паніку, а не фізічны ўдар па кім-небудзь, хоць непрыяцелі інтэрпрэтавалі словы Бібі менавіта так.

### Браты па зброі

Аднак масавыя пратэсты, якія ідуць па выхадных ужо які тыдзень, здаецца, не прайшлі дарма. Нягледзячы на непрымірымыя настроі ўлад і апазіцыі, была зменена жорсткая фармулёўка законапраекта, паводле якой у Вярхоўнага суда заставалася права блакіраваць рашэнні кнесета толькі аднагалосна і толькі ў тым выпадку, калі яны супярэчаць пунктам асноўных законаў. У новым варыянце тэксту адзначаецца, што для прызнання закона несапраўдным спатрэбіцца падтрымка толькі 80 працэнтаў ад поўнага складу калегіі Вярхоўнага суда.

Праўда, апазіцыя па-ранейшаму не згодная з такой нязначнай саступкай і патрабуе поўнай адмены юрыдычнай рэформы. З пачатку сакавіка актывісты перакрылі дарогі па ўсёй краіне. Дэманстранты ў Тэль-Авіве заблакіравалі ўваходы ў цягнікі, не дазваляючы пасажырам садзіцца або выходзіць з транспарту. «Важна падкрэсліць, што гэта толькі некаторыя падзеі, якія мы можам публічна зрабіць, — заявілі арганізатары, намякаючы, мабыць, на больш жорсткія пратэсты.

Пры гэтым міністр нацыянальнай бяспекі Ітамар Бен-Гвір адзначыў, што аддаў распараджэнне паліцыі «не дазваляць анархістам перакрываць цэнтральныя трасы». Нетаньяху падтрымаў Бэн-Гвіра і паліцыю. «Мы не прымаем гвалт у дачыненні да супрацоўнікаў паліцыі, перакрыцця дарог і грубае парушэнне законаў. Права на пратэст — гэта не права на анархію», — заявіў прэм'ер.

Арганізатары пратэстаў у адказ на гэта заўважылі, што «ў час, калі ўрад спрабуе ператварыць Ізраіль у дыктатуру, актыўны супраціў не права, а грамадзянскі абавязак». Тым часам паліцыя прымяняе шумавыя гранаты, вадамёты, задзейнічана конная паліцыя. Ужо ёсць затрыманні. Актывісты выступаюць каля ўваходаў у школы, на чыгуначных станцыях. На вуліцы выходзяць работнікі хайтэка, урачы, студэнты, фермеры выводзяць на дарогі калоны сельскагаспадарчай тэхнікі, адзначыла news.ru. Акцыі пачынаюцца ад самай раніцы, апошняя з іх запланаваны на вечар.

Прапанаваная судовая рэформа справакавала настолькі глыбокі палітычны раскол у ізраільскім грамадстве, што ў ход пайшлі новыя і незвычайныя для Ізраіля метады пратэсту. Так, 37 з 40 пілотаў-рэзервістаў элітнага эскадрона знішчальнікаў ВПС Ізраіля адмовіліся ад вучэнняў у знак пратэсту супраць дзеянняў урада. У іх сумеснай заяве гаварылася, што такое рашэнне было прынята ў імя дэмакратыі і адзінства народа Ізраіля. Група «Браты па зброі», якая аб'ядноўвае рэзервістаў ваенна-марскіх сіл Ізраіля, заблакіравала порт Хайфы, далучыўшыся да пратэстаў, якія працягваюцца ў краіне. Як піша The Times of Israel, у акцыі ўзялі ўдзел некалькі высокапастаўленых марскіх афіцэраў у адстаўцы.




Большасць ізраільцян да 40 гадоў, якія адслужылі тэрміновую службу, рэгулярна заклікаюцца для праходжання рэзервісцкай службы з мэтай абнавіць і ўмацаваць свае ваенныя навыкі. Армія ў цэлым і рэзервісты ў прыватнасці — аснова бяспекі Ізраіля, адзначыла «Бі-бі-сі». Адмова ад праходжання перападрыхтоўкі — беспрэцэдэнтны выпадак. Пазней лётчыкі пагадзіліся прыбыць у сваю часць, але запатрабавалі перагавораў са сваімі камандзірамі. Рэзервісты іншых відаў войскаў заяўляюць, што гатовы на такі ж крок, калі ўрад не адмовіцца ад рэформы.

### Справа для Сары

Тым часам стала вядома, што ў фінансаванні пратэстаў, накіраваных супраць судовай рэформы, Ізраіль абвінавачвае ЗША, паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на газету Times of Israel. «Гэты пратэст фінансуецца і арганізоўваецца з прыцягненнем мільёнаў долараў. Існуе арганізаваны цэнтр, з якога ўпарадкавана распаўсюджваюцца ўсе дэманстранты. Хто фінансуе транспарціроўку, сцягі, сцэны? Нам гэта зразумела», — цытуе выданне словы чыноўніка ўрада краіны. Чалавек з кола прэм'ер-міністра Ізраіля пацвердзіў, што чыноўнік казаў менавіта аб Вашынгтоне.

Ізраільскае грамадства раскалатае прыкладна напалову на прыхільнікаў перамен і іх сапернікаў. «Ёсць радыкальныя праамерыканскія сілы, якія жадаюць уладкаваць у Ізраілі майдан, праліць кроў і развязаць грамадзянскую вайну. Тады сітуацыя будзе развівацца непрадказальна», — заявіў эксперт па Ізраілі і Блізкім Усходзе Аляксандр Каргін.

З'яўляюцца і на першы погляд нечаканыя меркаванні наконт варыянтаў выхаду з крызіснай сітуацыі. Жан Коэн, былы стыліст жонкі прэм'ер-міністра Ізраіля Біньяміна Нетаньяху, упэўнены, што калі хто і можа адмяніць судовую рэформу ў Ізраілі і спраўкаваныя ёю масавыя пратэсты, дык гэта Сара, паколькі яе меркаванне мае вялікае значэнне для кіраўніка ізраільскага кабінета міністраў, піша выданне ICE. Па словах Коэна, яна вельмі моцная і ўплывовая жанчына, якая валодае «гіганцкімі магчымасцямі» ў сувязі з тым, што ўмее не толькі прымаць правільныя рашэнні, але і даносіць іх да свайго мужа. Уласным меркаваннем былы стыліст Нетаньяху падзяліўся з журналістамі, якія папрасілі яго пракаментаваць сітуацыю, у якой жонка прэм'ера апынулася ў пачатку сакавіка, калі натоўп дэманстрантаў, якія пратэстуюць супраць судовай рэформы, блакіраваў цырульню, у якую Сара Нетаньяху заехала пастрыгчыся. Спатрэбілася тры гадзіны і дапамога сотні паліцэйскіх, каб праправадзіць кардон удзельнікаў акцыі пратэсту і «вызваліць» жонку прэм'ера.

Чым жа ўсё скончыцца і ці працягнуць сотні тысяч людзей і надалей выходзіць на дэманстрацыі — пытанне адкрытае. Пакуль падобна, што пратэстоўцы настроены вельмі сур'ёзна. А ўлада адмаўляцца ад сваіх намераў таксама не плануе. Як распавёў на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку» ізраільскі журналіст Дзмітрый Дубаў, сацыяльныя пратэсты ў Ізраілі двойчы прыводзілі да адстаўкі дзейнага прэм'ера (Голды Мэір і Менахема Бегіна), але пры гэтым рэдка дасягалі сваёй мэты. Зрэшты, пажывём — пабачым.

**Захар БУРАК.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 31 марта 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % (лоты №№ 15–21); на 55 % (лот № 1); на 60 % (лот № 5); на 70 % (лоты №№ 6–14); на 80 % (лоты №№ 2, 3, 4); по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Условия продажи для лотов №№ 1, 5:** После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Покупателя (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается) | | |
| | **Информация о земельном участке лоты №№ 2, 3, 4:** кадастровый номер **321850100003004079** общей площадью **0,6706 га – для строительства и обслуживания административно-управленческого корпуса (для размещения объектов административного назначения) (право аренды доля ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин 189/250) . Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2 | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14327**, общей площадью **647,1** кв. м, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на пять транспортных единиц с диспетчерской** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпично-панельное здание гаража на пять транспортных единиц с пристроенной двухэтажной кирпичной диспетчерской). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9, гараж. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером 321850100003004080 общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1)**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9 | **57 780,00** | 5 778,00 |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-36340**, площадью **3 929,4 кв. м**, назначение – административное помещение, наименование – **административно-управленческий корпус**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2-1 | **230 880,00** | 23 088,00 |
| 3 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-36341**, площадью **363,0 кв. м**, назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – **нежилое изолированное помещение**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2-4 | **43 680,00** | 4 368,00 |
| 4 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-36342**, площадью **489,4 кв. м**, назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – **нежилое изолированное помещение**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д. Красный, 2-5 | **57 600,00** | 5 760,00 |
| 5 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14328**, общей площадью **692,4 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на восемь транспортных единиц** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража на восемь транспортных единиц). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/10, гараж. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером 321850100003004080 общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1)**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9. **Капитальное строение с инв. № 320/С-38833** общей площадью **4 241,6 кв. м**, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания транспортного цеха** (составные части и принадлежности: А-Автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа» г. Жлобина | **172 800,00** | 17 280,00 |
| | **Условие продажи для лотов №№ 6–21:** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества, на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние | | |
| 6 | Емкость для латекса (инв. № 142-6030) | **3 888,00** | 388,80 |
| 7 | Емкость для латекса (инв. № 142-6031) | **3 888,00** | 388,80 |
| 8 | Емкость для латекса (инв. № 142-6032) | **3 888,00** | 388,80 |
| 9 | Емкость для латекса (инв. № 142-6033) | **3 888,00** | 388,80 |
| 10 | Емкость для латекса (инв. № 142-6034) | **3 888,00** | 388,80 |
| 11 | Емкость для латекса (инв. № 142-6035) | **3 888,00** | 388,80 |
| 12 | Емкость для латекса (инв. № 142-6036) | **3 888,00** | 388,80 |
| 13 | Емкость для латекса (инв. № 142-6037) | **3 888,00** | 388,80 |
| 14 | Емкость для латекса (инв. № 142-6038) | **3 888,00** | 388,80 |
| 15 | Промышленная универсальная швейная машина двухниточного челночного стежка 1022М кл. (инв. № 142-42838) | **96,00** | 9,60 |
| 16 | Промышленная скорняжная швейная машина 810 кл. (инв. №142-42938) | **366,00** | 36,60 |
| 17 | Скорняжная машина однониточного цепного стежка GP 5- III, (инв. № 145-216) | **348,00** | 34,80 |
| 18 | Промышленная швейная машина (с ножом) 397 М (инв. № 142-42878) | **90,00** | 9,00 |
| 19 | Промышленная беспосадочная швейная машина двухниточного челночного стежка 862 кл, (инв. № 142-42829) | **120,00** | 12,00 |
| 20 | Промышленная швейная машина (с ножом) 397 М (инв. № 142-42878) | **294,00** | 29,40 |
| 21 | Промышленная беспосадочная швейная машина двухниточного челночного стежка 862 кл, (инв. № 142-42829) | **288,00** | 28,80 |

**Продавец:** ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович.

**Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** Р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 марта 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 29 марта 2023 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.**

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база». Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 09.11.2022 г. № 220(29842); от 03.12.2022 г. № 238 (29860); от 22.06.2022 г. № 120 (29742); от 29.10.2022 г. № 213 (29835); от 14.09.2022 г. № 180 (29802).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Гомельский домостроительный комбинат» (продавец) извещает о проведении 31 марта 2023 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Условие продажи:** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **Местонахождение лота:** Гомельская обл., г. Петриков, ст. Муляровка (территория участка по производству керамзита завода КПД ОАО «Гомельский ДСК») | | |
| 1 | **Кран монтажный специальный МКГС 100-1 ПКЗ (инв. 1281), тип – стреловой, самоходный на гусеничном ходу. Год изготовления – 1990, г/п 100 т** | **126 250,00** | 10 000,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельский ДСК», 246012, г. Гомель, ул. Лазурная, 17.

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляется по контактному тел. **8 (029) 373-08-42 Пусенков Анатолий Григорьевич.**

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельский ДСК»):** Р/с BY12 BLBB 3012 0400 0711 6600 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области г. Гомель, БИК BLBB BY2X, УНП 400071166, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 марта 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 29 марта 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) банковских дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество Продавцу в течение **5 (пяти) банковских дней** после подписания договора купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 10.01.2023 г. № 4 (29884).**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – **www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Коммунального дочернего унитарного предприятия «Кинотехпром» (продавец) в лице председателя ликвидационной комиссии Саковича В.П. извещает о проведении 31 марта 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 75 % (лот № 1); на 99 % (лот № 5) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Условие продажи: по лотам №№ 1, 5:** затраты по переоформлению документов на переход права собственности возлагаются на Покупателя | | |
| | **ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА СО СНИЖЕНИЕМ НА 90 % (ЛОТЫ №№ 1–105 (автозапчасти) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»** | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-81185**, общей площадью **3 264,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **Капитальное строение с инв. № 350/С-167549**, общей площадью **7,7** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное (проходная). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006414** общей площадью **0,2036 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТ № 1) размещен на сайте Организатора торгов www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».** **Условие продажи:** покупатель возмещает продавцу затраты по легализации земельного участка пл. 0,0041 га в сумме 2 699,44 бел. руб. | 479 791,80 | **47 979,18** |
| 5 | Сооружение – часть дворового покрытия, инв. № 01361031 (площадью 409,0 кв. м) | 618,68 | **61,87** |

**Продавец:** Коммунальное дочернее унитарное предприятие «Кинотехпром», 246007, г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 10.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 647-81-95 Сакович Вадим Павлович.**

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 марта 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 29 марта 2023 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 10.06.2022 г. № 112 (29734), от 09.06.2022 г. № 111 (29733).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы», на сайте www.gomel-region.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

Уладзімір ШАНТАРОВІЧ:

# «ПРАЦУЙЦЕ, СЦІСНУЎШЫ ЗУБЫ, І ПРАЧНЯЦЕСЯ ЗНАКАМІТЫМІ»

**Веславанне — спорт не для слабакоў. І справа нават не ў неймаверных нагрузках, залімітавых хуткасцях і тытанічных намаганнях. Многім веслярам даводзіцца пераадольваць фактары, на якія яны зусім не могуць паўплываць, — прыродныя і кліматычныя ўмовы. У Беларусі няма мора, увесь час трэніравацца ў той акваторыі, што ёсць, не дазваляе надвор'е. Тым не менш у гісторыі айчыннага веславання — 14 алімпійскіх чэмпіёнаў, шасцёра з іх пакарылі Алімп пад кіраўніцтвам Уладзіміра Уладзіміравіча Шантаровіча. Ён часта паўтарае, што спаборніцтвы — гэта бітва, на якую трэба выходзіць у поўнай баявой гатоўнасці. І як сапраўдны палкаводзец вядзе сваіх байцоў у атаку. Сёлета ва Уладзіміра Уладзіміравіча з веславаннем «залатая дата» — 50 гадоў як яны разам. І гэта найлепшая нагода, каб разам з мэтрам абмеркаваць веславанне на байдарках і каноэ, якое даўно стала брэндам айчыннага спорту.**



***— Уладзімір Уладзіміравіч, вас часта прыводзяць у прыклад, калегі і спартыўныя чыноўнікі раяць маладым спецыялістам «вучыцца ў Шантаровіча». На вашу думку, які галоўны ўрок ад вас трэба засвоіць?***

— Заўсёды прытрымлівацца сваёй жыццёвай стратэгіі. Калі ставіш перад сабой задачы, павінен імі жыць. Калі яны асобна, а тваё жыццё асобна — нічога не атрымаецца. У спорце, у любой галіне народнай гаспадаркі вынік дае выключна такі падыход. На маім трэнерскім вяку здольных спартсменаў было нямала. Але жыццё расстаўляла ўсіх на свае месцы: адны сыходзілі, іншыя прыходзілі. Заставаліся толькі самыя стойкія. Яны жылі тым, што рабілі, не думаючы аб прызнанні, фінансавых выгадах. І правільна рабілі. Малады чалавек, пачынаючы нейкую справу, адразу хоча зарабляць. Гэта ўтопія. Фінансавы поспех прыйдзе сам, калі працуеш. Гэта ні ў якім разе не павінна быць самамэтай. Ні адна клетачка не павінна штурхацца ў гэты бок. Грошы самі цябе знойдуць.

***— Дзякуючы такому падыходу вам удалося зрабіць Мазыр меккай беларускага веславання?***

— Высокі ўзровень мазырскай школы веславання — не толькі мая заслуга. Калі ў 1973-м годзе я прыехаў у Мазыр па размеркаванні, веславанне тут ужо развівалі спартыўныя таварыствы «Спартак», «Чырвонае знамя», «Працоўныя рэзервы». Ураджэнец Мазыра Леанід Дзеравянка ў 1974 годзе стаў чэмпіёнам СССР. Аб'ядноўваў вакол сябе дзяцей родапачынальнік веславання ў Мазыры Уладзімір Андрэевіч Паўлаў. Але сістэмнай працы па падрыхтоўцы спартсменаў не было. Пасля арміі я вярнуўся ў Мазыр з жаданнем развіваць веславанне. Запрасіў свайго сябра Віталя Скрыганава з Рагачова. На базе спартыўнага клуба «Спартак» мы разгарнулі актыўную дзейнасць. З Віталём Віктаравічам стварылі моцную дзіцяча-спартыўную школу з унутранай канкурэнцыяй. Вынік нашай працы ўсе ўбачылі на маладзёжным чэмпіянаце Еўропы 1979 года, адкуль нашы выхаванцы вярнуліся з медалямі. З часам мы выбудавалі сістэму, якую за прыклад варта было б узяць усім відам спорту. Пасля дзіцяча-спартыўнай школы нашы весляры пераходзяць у вучылішча алімпійскага рэзерву, затым паступаюць у ВНУ; калі прадаўжаюць паказваць вынікі, аказваюцца ў школе вышэйшага спартыўнага майстэрства; найлепшыя з найлепшых уваходзяць у нацыянальныя і зборныя каманды.

***— У вашай трэнерскай біяграфіі ёсць перыяд работы ў зборнай Савецкага Саюза. Што самае галоўнае вынеслі з таго часу?***

— Савецкая школа веславання была наймацнейшай у свеце дзякуючы прафесійным трэнерам, баяздольным спартсменам і навуцы. Зборная супрацоўнічала з навукова-даследчым інстытутам, брыгада вучоных пастаянна назірала за станам спартсменаў. Навукоўцы стварылі мноства метадычных распрацовак. У супрацоўніцтве з вучонымі трэнеры праводзілі селекцыйныя адборы, вывучалі роста-вагавыя паказчыкі, выкарыстоўвалі навуковы падыход пры распрацоўцы інвентару. Тады я зразумеў, што навука — аснова спорту. Веславанне — хуткасна-сілавы від, значыць, спартсмен павінен быць шматфункцыянальным. Весляры — гэта мнагаборцы. Яны не зацыкліваюцца на адной дыстанцыі. Мы трэніруем і 1000, і 500 і 200 метраў у двойцы, адзіночцы і чацвёрцы. Можна толькі ўявіць, на якім узроўні павінны быць працаздольнасць і цягавітасць. Вясляр павінен быць схільным да сілавых нагрузак, мець якасці бегуна, скакуна, плыўца. Важна ўсё: аб'ём лёгкіх, максімальная сіла, каардынацыя руху, нервова-мышачная праводнасць. Без навукі выконваць усе гэтыя патрабаванні — дарма марнаваць час і сілы. Працуючы ў зборнай СССР, я старанна ўнікаў у спартыўную навуку. І вяртаючыся ў Беларусь пасля распаду Савецкага Саюза, вёз з сабой чамаданы навуковай літаратуры. Хаця ў 1990-х гэтая навука хвалявала толькі такіх фанатаў, як я. Большасць людзей думалі, як жыць на сярэдні заробак у 5—7 долараў.

***— Усё было так дрэнна?***

— Жудасна. З развалам Савецкага Саюза ўсе вяслярныя базы засталіся за межамі Беларусі. Стары сарайчык на беразе ракі, у якім з-за скразнякоў немагчыма было пераапрануцца, — вось на такіх базах працавалі нашы весляры. І трымаліся, самі рамантавалі, прыводзілі ў парадак гэтыя сарайчыкі. За тое, што наша веславанне перажыла тыя часы, варта падзякаваць трэнерам, якія здолелі забраць дзяцей з вуліц і захапіць іх так, што яны ў гэтых адрынках знікалі цэлымі днямі. Бо, па вялікім рахунку, дзеці ідуць не ў від спорту, а да трэнера. У найскладанейшыя часы веславанне трымалася на людзях, на спартсменах, аддадных сваёй справе. І вучні іх выраслі ў моцных мужных байцоў, якія, пачаўшы з застаронкаў, перамагалі на галоўных сусветных рэгатах.

***— У іх гэта атрымалася не без вашага ўдзелу. Вы ўзначалілі нацыянальную зборную ў 2001 годзе не ў лепшы для яе час. Як гэта — брацца за справу, якую трэба вяртаць з заняпаду?***

— Страху ці няўпэўненасці не было зусім. Узначаліўшы нацыянальную зборную, я адразу сказаў спартсменам: «Працуйце, сціснуўшы зубы, і прачняцеся знакамітымі». Я ўсё жыццё такім прынцыпам кіруюся. Я не меў ніякіх ілюзій, выдатна разумеў, з кім прыйдзецца спаборнічаць. Я ведаў, што сабой уяўляюць немцы, румыны, венгры. Самае галоўнае — я мог растлумачыць іх перамогі, бачыў усе іх памылкі. Аснова любога поспеху — працаздольнасць. Я не разважаю аб талентах. Талент — гэта 99 працэнтаў працы. Рома Петрушэнка, Вадзім Махнеў, Алег Юрэня — эталон працаздольнасці. У веславанні трэба здзекавацца з сябе і атрымліваць ад гэтага задавальненне. Інакш ніяк. На Алімпійскіх гульнях 2004 года, маіх першых Гульнях на пасадзе галоўнага трэнера зборнай, Рома Петрушэнка і Вадзім Махнеў сталі бронзавымі прызёрамі ў двойцы. І я не бачу ў гэтым ніякай фантастыкі, гэта мэтанакіраванасць, працаздольнасць спартсменаў, вера ў тое, што ты робіш. Праца і поўная самааддача заўсёды акупляюцца. Заўсёды.

***— А калі яны падмацаваныя спартыўнай навукай — тым больш?***

— Безумоўна. Для трэнера, які рыхтуе спартсмена да Алімпійскіх гульняў, дробязяў не бывае. Трэба ўлічваць усё: медыцыну, фармакалогію, псіхалогію. На жаль, самае слабае месца ў нашым спорце — навука. Часта можна пачуць, маўляў, Шантаровіч усё ведае. Не ўсё. Вывучэнне новых методык, удасканаленне сваіх ведаў, пастаяннае развіццё павінны быць уключаны ў расклад трэнера кожны дзень. Калі спецыяліст, які працуе з вышэйшым спартыўным звяном, не можа растлумачыць сваю перамогу — яму трэба ісці ў бібліятэку вывучаць фізіялогію, біялогію, біямеханіку, хімію. Сёння для гэтага створаны ўнікальныя ўмовы. А большасць трэнераў не можа растлумачыць ні перамог, ні паражэнняў. Аб якім спорце вышэйшых дасягненняў у такім выпадку можа ісці гаворка? Не будзе навукі — не будзе спорту. Нацыянальныя зборныя будуць займацца здаровым ладам жыцця, фізкультурай. Але мы ж гаворым пра сцяг і гімн. Сваіх спартсменаў я ведаю лепш, чым іх бацькі. Я ведаю, як працуе кожная клетка іх цела. І кожны трэнер, які хоча дабіцца выніку, павінен ставіць навуку на першае месца.

***— Уладзімір Уладзіміравіч, вы часта кажаце пра «філасофію пераможца». Растлумачце, калі ласка, што ўкладваеце ў гэта паняцце.***

— На Алімпійскіх гульнях хто павінен выступаць? Толькі воіны, не ваякі — воіны. Воін — той, хто ўступае ў бой без страху, у яго няма комплексаў і страху. Выйграць Алімпіяду — гэта подзвіг, здзейсніць які здольны толькі сапраўдны воін. Таму што Алімпійскія гульні — сапраўдная бітва, і ўсе разумеюць, што на алімпійскім канале трэба змагацца. Воін — гэта яшчэ і той, хто, сышоўшы з п'едэстала, знаходзіць у сабе сілы заўтра пачаць усё спачатку. Так, сёння ты пераможца ў вайне (а Алімпіяда — гэта вайна). Увесь свет быў тваім сапернікам, і ўвесь свет табе апладзіраваў. Ты стаіш на п'едэстале, і ты герой. Але званне алімпійскага чэмпіёна не дае права спачываць на лаўрах. Убачыў сцяг, паслухаў гімн, сышоў з п'едэстала — і пачынай усё спачатку. Гэта і ёсць філасофія пераможцы. А што такое чалавек без філасофіі? Што гэта такое?

***— Яшчэ адзін ваш цікавы тэрмін «відушчая Алімпіяда». Што гэта азначае?***

— Гэта Алімпіяда, на якую прыязджаеш вопытным, прымаеш да ўвагі нават дробязь і ведаеш, на што здольны. Для мяне відушчай была Алімпіяда ў Пекіне. Я разумеў, у якой форме мае спартсмены, і ведаў, на што яны здольныя. У Пекіне хлопцы праявілі сябе воінамі. Я на Сашу Багдановіча ваду ліў, яна шыпела. Хлопцы ў чацвёрцы ў бітве раскрыліся. Рухальнай сілай гэтага экіпажа была звязка Рома Петрушэнка — Вадзім Махнеў. Менавіта яны рухалі ўсю каманду. Лёша Абалмасаў ураўнаважаны, псіхалагічна зацэментаваны. Артур Літвінчук, вядома, у Пекіне быў дзіця горкае, але я абраў Артура, таму што ён быў псіхалагічна надзейны.

***— Вы прад'яўляеце высокія патрабаванні да спартсменаў. А якім крытэрыям, на вашу думку, павінен адпавядаць трэнер?***

— Трэнер павінен быць сапраўдным педагогам. Што залежыць ад касманаўта? Яго падрыхтавалі, пасадзілі ў ракету, далі ўказанні. Так і мы саджаем у лодку спартсмена, а ён павінен выканаць стратэгію праходжання дыстанцыі, якая б адпавядала залатому медалю. Гэта ні ў якім разе не перамога любой цаной. Гэта выключна майстэрства, якое трэнер можа данесці да спартсмена. А на гэта здольны толькі сапраўдны педагог. Спецыяліст, які, адпрацаваўшы дзень, забываецца пра яго — выпадковы чалавек у спорце. Рыхтаваць спартыўны рэзерв павінны толькі сапраўдныя педагогі, якія адчуваюць спартсмена і разумеюць, якую нагрузку яму даваць. Мы сёння шмат ўвагі ўдзяляем рэзерву. На мой погляд, яго нават можна адпусціць. Вучылішча алімпійскага рэзерву выцягвае з маладых спартсменаў усе сокі. Калі я сам не ўнікаю ў падрыхтоўку рэзерву і не сачу за імі, яны прыходзяць зусім не ў тым стане, у якім патрэбны зборнай. У вучылішчы не трэба перамагаць усіх і ўся, у гэты перыяд трэба даць арганізму магчымасць стаць мнагаборцам.

***— Сёлета вашай алімпійскай перамозе ў Пекіне спаўняецца 15 гадоў. Але пакуль няма такога экіпажа, як Махнеў, Петрушэнка, Літвінчук, Абалмасаў. Чаму?***

— Стварыць такую лодку для мяне асаблівай цяжкасці не складае. Але трэба, каб гэтая лодка ў патрэбны момант сябе паказала. А ў нас гэты патрэбны момант увесь час прыбіраюць. Наша развіццё сур'ёзна затармазілі «допінгавыя» разбіральніцтвы ў 2016 годзе. Ды і адхіленне спартсменаў ад Алімпійскіх гульняў наносіць вялікі ўрон. У 2021 годзе паўплывала празмерная мітусня на Алімпіядзе. Здавалася б, усё ўлічылі, ужо да ўсяго былі гатовыя. Але псіхалагічны фактар пасыпаўся, і ўсё. У такія моманты рукі апускаюцца. Але жыццё працягваецца. Воін павінен умець перажыць стрэс і пайсці далей. А калі спартсмен не можа сабрацца і ўвесь час ходзіць спустошаны і непрацаздольны, значыць, яму трэба сыходзіць у народную гаспадарку. Сённяшняе адхіленне ад міжнародных стартаў таксама радасці не дадае, асабліва калі Алімпійскія гульні ўсё бліжэй. Мора праблем, зімовыя трэніроўкі дома, апухлыя ад холаду пальцы, поўная невядомасць могуць затушыць азарт нават у самага моцнага воіна.

***— Уладзімір Уладзіміравіч, вашы вучні заваёўвалі медалі на Алімпійскіх гульнях, сабралі россып узнагарод чэмпіянатаў свету і Еўропы. У айчыннага веславання выдатныя традыцыі. А ці ёсць нешта, чаго яму пакуль не хапае?***

— Я б многае аддаў, каб беларуская школа жаночага веславання на байдарках і каноэ нарэшце заваявала залаты медаль Алімпійскіх гульняў. Тады б мая душа была спакойная. Пакуль медаля няма, таму трэба працаваць, шукаць таленавітых здольных спартсменак, зараджаць іх, ператвараць у воінаў.

***— А чым вы больш за ўсё ганарыцеся?***

— Тым, што маёй сілы волі хапіла, каб застацца ў спорце пасля ўсіх перажытых раздраяў. Часам думаю, што я ўжо моцна загуляўся ў веславанне. Ёсць жа нейкае іншае жыццё. А я памяшаны на спорце, навуцы, методыцы, развіцці. Можа, так і не трэба? Ды, калі так не рабіць, то і майго жыцця не будзе. Акрамя веславання, нічога не ўмею. Таму ўсё роўна кожны дзень прыходжу ў кабінет і пачынаю пісаць, аналізаваць. Ніколі не спыняюся ў пошуку новых формул, методык, схем працы. І калі бачу вынік пошуку, разумею, што гэта фантастычна прыгожа. Веславанне — метры і секунды, секунды і метры. І паказаць найлепшыя ў свеце секунды, стаць алімпійскім чэмпіёнам — гэта подзвіг, які застаецца на стагоддзі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# Класіка ў новым фармаце

## Што падрыхтавала выдавецтва «Мастацкая літаратура» да кніжнай выставы-кірмашу

**ДЛЯ ўдзелу ў XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выставе, якая пачнецца ўжо на наступным тыдні, беларускія выдавецтвы традыцыйна падрыхтавалі шмат цікавых і яркіх імпрэз. Зразумела, усе сакрэты яны загадзя не выдадуць, але даведацца пра некаторыя цікавінкі, каб не прапусціць, можна. Дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК пацвердзіў, што кожны дзень у іх запланаваны прэзентацыі, творчыя сустрэчы, аўтограф-сесіі.**

— У першы дзень выставы-кірмашу, 22 сакавіка, адзначаецца сумная дата — дзень Хатынскай трагедыі. Мы хочам прэзентаваць некалькі кніг на тэму вайны. Гэта легендарныя выданні «Я з вогненнай вёскі» і «Ніколі не забудзем», зборнік вершаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне, і іншыя нашы праекты на ваенную тэму. Сярод не менш значных мерапрыемстваў — праект, які і новы, і адначасова з'яўляецца працягам даўняга праекта «Мастацкай літаратуры». Шмат гадоў у выдавецтве выходзіла серыя «Бібліятэка беларускай паэзіі». Апошняя кніга гэтай серыі выйшла ў 1993 годзе, а да гэтага, напэўна, усе знакавыя беларускія паэты ў ёй выйшлі, пачынаючы ад Францішка Багушэвіча і заканчваючы маладымі, але ўжо вядомымі на той час паэтамі. Праз трыццаць гадоў перапынку мы вырашылі аднавіць гэтую серыю, назваўшы яе «Новая бібліятэка беларускай паэзіі». Сёлета ў ёй запланавана некалькі кніжак, да выставы мы падрыхтавалі дзве з іх. Гэта зборнік Яўгеніі Янішчыц, 75-гадовы юбілей якой мы сёлета адзначаем, і кніжка Навума Гальпяровіча, які адзначае такі ж юбілей.

***— Ці прыме ўдзел у прэзентацыі сам паэт?***

— Безумоўна, прыме, так што раю наведвальнікам не прапусціць магчымасці атрымаць аўтограф юбіляра. І гэта не ўсе сёлета юбілеі, якія мы адзначым. Часопісу «Маладосць» спаўняецца 70 гадоў, і ў нас цэлы суботні блок мерапрыемстваў прысвечаны як гэтаму часопісу, так і ўвогуле маладой беларускай літаратуры. Выступяць маладыя аўтары, кнігі якіх выходзілі апошнім часам у нас, адбудзецца прэзентацыя альманаха «Першацвет», творы якога складаюць апавяданні і вершы пераможцаў аднайменнага конкурсу. Гэта праект, які рэалізоўваецца і «Мастацкай літаратурай», і Саюзам пісьменнікаў Беларусі, і Міністэрствам інфармацыі.

***— Ці шмат было прэтэндэнтаў на перамогу?***

— Безумоўна, шмат, як і кожны год. З іх адбіраюцца дзесяць паэтаў і дзесяць аўтараў празаічных твораў. Пройдзе таксама прэзентацыя кнігі мінулагодняй фіналісткі яшчэ аднаго конкурсу, «ЛітUP», Галіны Пярун. Гэты конкурс праводзіць Міністэрства інфармацыі, даючы магчымасць таленавітым аўтарам рэалізаваць свой праект у кнізе. Галіна Пярун працуе ў запатрабаваным жанры — маладая аўтарка напісала містычную аповесць «Зачараваны скідзень», тое, чаго сёння не хапае — літаратуры для падлеткаў. Апроч таго, у праграме — сустрэча з нашым пастаянным аўтарам Аляксандрам Радзьковым. Толькі што выйшла яго чарговая кніжка «Пра матэматыку і матэматыкаў». Аляксандр Міхайлавіч Радзькоў — асоба вядомая, і сустрэчы з ім праходзяць заўсёды вельмі цікава. І я не сумняваюся, што і прэзентацыя яго



новай кніжкі таксама збярэ нямала прыхільнікаў яго творчасці і як навукоўца, і як пісьменніка.

***— Чые яшчэ аўтограф-сесіі плануеце?***

— Сярод вядомых аўтараў, у якіх можна будзе папрасіць аўтограф, — і Віктар Шніп, і Валянціна Паліканіна, і Анатоль Зэкаў. Мы стараліся, каб аўтограф-сесіі маглі прыцягнуць увагу людзей самых розных, таму што «Мастацкая літаратура» — выдавецтва, якое арыентуецца на самую шырокую чытацкую аўдыторыю.

***— Ці будуць адлюстраваны міжнародныя літаратурныя сувязі?***

— Безумоўна. На стэндах вы пабачыце кнігі беларускіх пісьменнікаў на іншых мовах. Сярод іх — кніжка, якая толькі што выйшла ў Кітаі, прадстаўляе сучасных беларускіх паэтаў і празаікаў у перакладзе на кітайскую мову. Апроч таго, будуць прадстаўлены кнігі нашых класікаў і сучасных пісьменнікаў, якія выходзілі ў краінах СНД, у Расіі, Манголіі, Паўднёвай Карэі, у іншых краінах свету. Дарэчы, працаваць будзем у фармаце міні-студыі — усе прэзентацыі можна пабачыць не толькі ўжывую, але і ў анлайн-фармаце, відэазапісы з'явяцца ў інтэрнэце.

***— Ці будзеце прадстаўляць зборы твораў класікаў, якія ў вас выходзяць?***

— Безумоўна. І збор твораў Уладзіміра Караткевіча, і збор твораў Янкі Брыля. Але мы зрабілі акцэнт не толькі на шматтомных выданнях таго ці іншага беларускага пісьменніка, але і на аднатомніках і двухтомніках выбраных твораў. У нас з'явілася адразу некалькі праектаў, прысвечаных менавіта такому фармату. Гэта праект «Народная бібліятэка», дзякуючы якому мы выдаём творы класікаў і сучасных аўтараў па выніках апытанняў чытачоў. Мы пачалі серыю з Максіма Багдановіча, потым выдалі Купалу, Коласа, Караткевіча, Быкава, Маўра, а сёлета — Георгія Марчука, Вячаслава Адамчыка і том Аляксея Дударава, які, на жаль, нядаўна пайшоў з жыцця. Гэты праект набыў вядомасць, вельмі запатрабаваны. Том Максіма Багдановіча вытрымаў два выданні, і думаем пра тое, каб перавыдаць яго яшчэ раз. Акрамя таго, у нас з'явілася яшчэ адна новая серыя, якая выходзіць на рускай мове, — «Мир классики». Мы выдалі ў ёй том Івана Мележа і том Уладзіміра Караткевіча.

***— Якая мэта гэтай серыі?***

— Беларуская літаратура ў перакладзе на рускую апошнія дзесяцігоддзі выходзіць вельмі рэдка, і калі мы бываем на замежных кніжных выставах, бачым, што, на жаль, беларуская літаратура там прадстаўлена даволі бедна, як правіла, кніжкамі ў перакладзе на рускую мову, якія выходзілі яшчэ ў савецкі час. Мала таго што тыя кніжкі ўжо страцілі таварны выгляд, за гэты час у нас з'явіліся новыя пісьменнікі, якія напісалі творы, вартыя таго, каб пра іх ведалі. І мы спрабуем гэтую нішу запоўніць. Мяркуючы па першых кніжках серыі, яны запатрабаваныя як у замежжы, так і ў Беларусі.

***— «Мастацкая літаратура» традыцыйна добра выступае на Нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі». У гэтым годзе вашы выданні ўдзельнічаюць?***

— Удзельнічаем, але якія нашы праекты пераможгуць, не ведаем, гэта будзе вядома падчас выставы. Аднак калі гаварыць пра афармленне нашых кніг, мне вельмі прыемна, што ў выдавецтве працуюць мастакі, дызайнеры розных узростаў, якія здольныя здзейсніць увесь багаты спектр сучаснай кніжнай ілюстрацыі. Дзякуючы гэтаму мы можам задаволіць густы самых розных чытачоў.

***— У якіх прэзентацыях возьмеце ўдзел асабіста?***

— Кожны дзень буду на той ці іншай імпрэзе. Скажам, калі згадаць кніжку Яўгеніі Янішчыц у серыі «Новая бібліятэка беларускай паэзіі», то я быў укладальнікам, таму, безумоўна, буду ўдзельнічаць у яе прэзентацыі. Запрашаем!

# Пра духоўную адметнасць беларусаў

## Якія навінкі выдавецтва «Беларусь» пакажа на кніжнай выставе-кірмашы

**На кожнай Мінскай міжнароднай выставе-кірмашы стэнды выдавецтва «Беларусь» прыцягваюць увагу наведнікаў: дыхтоўныя фотаальбомы, кнігі па нацыянальнай гісторыі і культуры... Усё, што адлюстроўвае адметнасць нашага народа, яго духоўныя здабыткі. Якія ж цікавыя навінкі прадставіць выдавецтва на выставе-кірмашы, што адкрываецца на наступным тыдні?**

— Найперш хачу згадаць нашы выданні, якія датычацца захавання гістарычнай памяці, — распавядае **дырэктар выдавецтва «Беларусь» Сяргей ПЕШЫН.** — Гэта кнігі «Генацыд беларускага народа» і «Генацыд беларускага народа. Лагеры смерці». У першай сабраныя даведачна-аналітычныя матэрыялы пра генацыд беларускага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны, у пасляваенны перыяд, а таксама прыводзяцца ўражлівыя дакументы, якія датычацца падзей найноўшага часу. У другой кнізе прадстаўлены новыя і раней невядомыя звесткі пра лагеры смерці на тэрыторыі БССР у перыяд нацысцкай акупацыі. Уключаны таксама матэрыялы крымінальнай справы пра генацыд насельніцтва Беларусі. Абедзве кнігі адрасаваны шырокаму колу чытачоў — не толькі даследчыкам, але і ўсім, хто цікавіцца гісторыяй. Звярну таксама ўвагу на кнігу «Хатынь». Выданне распавядае пра мемарыял на месцы спаленай беларускай вёскі, якая стала сімвалам трагедыі ўсяго беларускага народа. Акрамя апісання аб'ектаў комплексу, у кнізе даецца гістарычная даведка аб Хатыні,



згадваюцца вёскі, якія напаткаў такі ж самы лёс. Адной з трагічных старонак гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі, а менавіта масавай гібелі савецкіх ваеннапалонных у шталагу № 354 на тэрыторыі вайсковага гарадка ў Наваполацку, прысвечана кніга «Шталаг № 354. Гісторыя і памяць». Выданне пабачыла свет у нашай серыі «Беларусь. Трагедыя і праўда памяці». У тым лагеры ўтрымлівалася 29 000 савецкіх ваеннапалонных, з іх 18 000 загінула. Асобна распавядаецца пра лёс вязняў-жанчын, а таксама пра лёсы тых ваеннапалонных, каму ўдалося ўцячы са шталагу і працягнуць барацьбу. Гэтай жа тэме прысвечана яшчэ адно наша выданне, якое мы прадставім на выставе-кірмашы, — «Лагеры савецкіх ваеннапалонных у Беларусі: 1941—1944». Там прыводзіцца шмат архіўных дакументаў, якія сведчаць пра нечалавечыя ўмовы ўтрымання савецкіх ваеннапалонных у лагерах, створаных нацыстамі на Беларусі. Спадзяёмся, што шмат прыхільнікаў збярэ прэзентацыя кнігі вядомага пісьменніка Вячаслава Бандарэнкі «За други своя. Герои и подвиги Беларуси». Прэзентуем таксама багата ілюстраванае навукова-папулярнае выданне «Дзень народнага адзінства», прысвечанае дзяржаўнаму святу Рэспублікі Беларусь. Там дакументальна даказваецца, чаму дзень 17 верасня, з якога пачалося аб'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, стаў актам гістарычнай справядлівасці ў дачыненні да беларускага народа, падзеленага супраць яго волі ў 1921 годзе па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора.

Будзе на выставе прадстаўлена і тая кніжная прадукцыя выдавецтва «Беларусь», якая прысвечана сучаснасці. Кнігі Андрэя Мукавозчыка «Чему учить детей» і Людмілы Гладкай і Юрыя Цераха «Изнанка мятежа» заснаваны на матэрыялах газеты «СБ. Беларусь сегодня», якія распавядаюць пра падаплёку нядаўніх палітычных падзей. Абедзве кнігі аздоблены малюнкамі мастака Алега Карповіча. Дыхтоўны альбом на трох мовах «Нацыянальная бібліятэка Беларусі. 100 гадоў» расказвае пра галоўную кніжную скарбніцу краіны, што нядаўна адзначыла векавы юбілей.

Як заўсёды, на стэндзе выдавецтва адбудзецца прэзентацыя кніг пра народную культуру. Дзве кніжныя навінкі распавядуць пра беларускую кухню. Кніга «Смак беларускай гісторыі» вядомай даследчыцы Алены Мікульчык адметная тым, што рэцэпты старадаўніх страў адаптаваны пад сучасныя прадукты і тэхналагічныя прыёмы так, каб чытач мог лёгка паўтарыць гэта на сваёй кухні. Кожная страва суправаджаецца цікавай гісторыяй паходжання. Кніга «Беларуская кухня» пабудавана на базе працы знакамітага беларускага этнографа Нікіфароўскага «Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности». Усе рэцэпты страў, а сярод іх нават такія напаўзабытыя, як аўсяны кісель, саладуха, крупеня, камы, стульцы, пададзены на беларускай, рускай і англійскай мовах.

Не абыдзена ўвагай і беларускае мастацтва. Тыя, хто наведае стэнд выдавецтва «Беларусь», убачаць альбом «Ю. М. Пэн», падрыхтаваны мастацтвазнаўцай Таццянай Старынскай, і альбом Уладзіміра Пракапцова «Народнае мастацтва Беларусі. Кераміка, мастацкія тканіны, разьба і роспіс па дрэве, саломапляценне і інкрустацыя». Апошняе выданне працягвае фундаментальны шматтомны навукова-адукацыйны праект Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь «Нашы калекцыі».

Кожны дзень выставы-кірмашу выдавецтва будзе ладзіць імпрэзы, да якіх шчыра запрашае ўсіх далучацца.

**Падрыхтавала Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Ігар БУЗОЎСКІ:

# «КНІГА ДЛЯ НАС — ГІСТОРЫЯ ПРА СТВАРАЛЬНУЮ ПРАЦУ, А НЕ КАМЕРЦЫЯ»

**Лічаныя дні засталіся да старту XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Яна ўжо трыццаць гадоў выступае месцам прыцягнення літаратараў, кнігавыдаўцоў і кнігалюбаў. Праекты пад яе эгідай нязменна выклікаюць вялікі інтарэс не толькі ў прадстаўнікоў беларускага кнігавыдання, але і ў шэрагу замежных краін: Расіі, Казахстане, Іране, Кітаі, Кубе і Венесуэле. Прэзентацыя новых кніжных праектаў, абмеркаванні актуальных пытанняў кнігавыдавецкай сферы, сустрэчы з пісьменнікамі, майстар-класы, фотазоны — палітра мерапрыемстваў будзе насычанай і разнастайнай. Даведаліся ў намесніка міністра інфармацыі Ігара БУЗОЎСКАГА пра адметнасці юбілейнага кніжнага форуму, яго новыя фарматы ўзаемадзеяння з чытачамі, а таксама пра галоўныя задачы кнігавыдання.**



***— Ігар Іванавіч, пад якім слоганам і з якімі акцэнтамі плануецца правядзенне XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу?***

— Кожны год выстаўка мае адметнасці, і сёлета яна таксама будзе са сваімі цікавінкамі. Перш за ўсё, XXX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш адметная тым, што яна юбілейная. Той факт, што мерапрыемства такога фармату існуе вось ужо трыццаць гадоў, само па сабе ўжо падзея. Такога кшталту кніжныя выстаўкі сёння рэдкасць, таму мы смела можам гаварыць аб тым, што Мінская міжнародная выстаўка-кірмаш — падзея ў сваёй сферы сусветнага маштабу. І тая ўвага, якая ў Беларусі ўдзяляецца кнізе, — сведчанне, што для кіраўніцтва нашай дзяржавы і непасрэдна Прэзідэнта Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі гэтая тэма мае асаблівае значэнне. Мы разумеем, што, нягледзячы ні на якія ўмовы: сацыяльныя, эканамічныя ці палітычныя — кніга была, ёсць і застанецца сур'ёзным інструментам для арганізацыі жыццядзейнасці грамадства.

У нас выстаўка-кірмаш не арганізоўваецца як нешта адасобленае ад працэсаў, што адбываюцца ў грамадстве, таму сёлета як асновай стаў Год міру і стваральнай працы. І слоган мы выбралі адпаведны — «Свет кніг без межаў». Такі пасыл будзе спалучацца з кніжнымі праектамі, што прымеркаваны да акрэсленай тэмы, а таксама былі падрыхтаваны, выдадзены за апошнія гады. На гэтым плануем зрабіць акцэнт і на пляцоўках самой выстаўкі, прычым як у самім выставачным комплексе, так і за яго межамі.

***— Датычна інтэрактыўнага ўзаемадзеяння з наведвальнікамі на што варта звярнуць увагу?***

— Цікавых лакацый і мерапрыемстваў, звязаных з правядзеннем выстаўкі, будзе шмат. У першую чаргу, задача нас як арганізатараў — забяспечыць магчымасць пісьменнікам прэзентаваць і паказаць свае кнігі. Таксама будуць прадстаўлены і нашы сумесныя праекты з аўтарамі з розных прафесійных колаў. Менавіта спалучэнне кнігі і аўтара павінна, на нашу думку, быць асновай дадзенай выстаўкі-кірмашу. На стэндах выдавецтваў запланавана насычаная праграма, у тым ліку віктарыны, відэаэкскурсіі, майстар-класы і шмат іншага.

Асобна трэба спыніцца на прэзентацыі кніг. Гэта будзе ажыццяўляецца не толькі ў традыцыйным фармаце (паглядзець ці паслухаць распавед пра выданне, пры жаданні набыць яго). Будуць і новаўвядзенні, адметныя знакавыя мерапрыемствы. Напрыклад, сёлета мы хацелі акцэнтаваць увагу на сімпозіуме «Пісьменнік і час». Гэтым разам ён будзе праводзіцца сумесна з БДУ пад слоганам «Някніжны свет». На пляцоўцы ўніверсітэта 21 сакавіка будуць абмяркоўвацца тэмы міру, стваральнай працы як з пісьменнікамі, так і з прадстаўнікамі розных сфер, якія рэалізоўваюць сябе ў літаратуры. Плануем, што работа такой пляцоўкі зверне на сябе ўвагу. Назіраць за дыскусіяй пісьменнікаў, кнігавыдаўцоў і распаўсюджвальнікаў кніг можна будзе і анлайн. Таму ўсіх запрашаем у аўторак з 14.00 далучацца да гутаркі. Таксама ў рамках сімпозіума прэзентуем кніжную паліцу «Інтэлектуальная кніга», дзе адабраны выданні, якія спрыяюць развіццю нашага грамадства.

Калі гаварыць пра адкрыццё выстаўкі, то яе дата, 22 сакавіка, прыпадае на дзень памяці Хатынскай трагедыі. Сваімі мерапрыемствамі мы хочам аддаць даніну памяці ахвярам генацыду беларускага народа. Гэтая тэма знойдзе адлюстраванне як у афармленні, так і ў сцэнарыі цырымоніі адкрыцця XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. І кнігі будуць прэзентаваны менавіта па дадзенай тэматыцы, у прыватнасці выданне «Генацыд беларускага народа» (яно ўжо трэці раз перавыдаецца). Жадаем, каб атрымалася шчымлівая размова пра падзеі мінулага, якое сёння мы пераасэнсоўваем. Лічу, што такога роду праект знойдзе свой водгук, нягледзячы на тое, што ў нас шырокамаштабная выстаўка, якая аб'ядноўвае самыя розныя краіны і інтарэсы наведвальнікаў. Бо важна падкрэсліць, што сёння мы працуем і ствараем дзякуючы тым вялікім перамогам і ахвярам, якія заплаціла за гэта наша зямля і нашы людзі.

Плануем сёлета пашырыць і напаўненне выстаўкі. Яна прырасце міжнародным кварталам, над арганізацыяй якога працуем сумесна з Міністэрствам замежных спраў і які прэзентуем асобна. Там будзе прадстаўлена шырокая палітра менавіта замежнай літаратуры.

А вось афармленне выставачнай пляцоўкі мае на ўвазе развіццё тых праектаў, якія мы ўвядзём таксама не першы год. Адзін з такіх — «Бацькаўшчына», што будзе ўвасоблены на нашым нацыянальным стэндзе ў выглядзе арт-аб'ектаў. Напрыклад, адна пляцоўка будзе абазначана ўжо знаёмым многім зубрам (выкананым з запчастак друкарскіх станкоў). Яшчэ два падобныя аб'екты стануць сюрпрызам для наведвальнікаў і значна ўпрыгожаць выставачную прастору.

Будзе ў нас і працяг праекта «кніжная паліца». Ідэю мы некалі падхапілі ў нашых калег у Санкт-Пецярбургу, але дапрацавалі на свой лад. Праект, накіраваны на папулярызацыю каштоўнасцяў беларускага грамадства праз кнігі, мы спачатку прэзентавалі ў Добрушы на Дні беларускага пісьменства. Першая падборка была прысвечана паняццю «справядлівасць». А ў рамках выстаўкі-кірмашу прадставім 12 кніг-пробнікаў (з кароткімі вытрымкамі з твораў, QR-кодамі для іх пошуку ў сеціве і з укладышам чайнай кампазіцыі з беларускіх зёлак), дзе раскрываецца паняцце «мір».

***— Ці прадугледжаны нейкія фарматы ўзаемадзеяння з аўдыторыяй, якая мае жаданне, але не можа трапіць на тыя ці іншыя мерапрыемствы ў рамках выстаўкі?***

— Адно з новаўвядзенняў — камунікацыю на пляцоўцы Нацыянальнага стэнда мы хочам арганізаваць у фармаце інтэрв'ю. На працягу дзеяння выстаўкі там будуць праводзіцца прэзентацыі новых кніжных праектаў у фармаце дыялогаў, дыскусій журналістамі вядучых СМІ Беларусі. І іх трансляцыя — на інтэрнэт-рэсурсах Міністэрства інфармацыі, суарганізатараў і партнёраў.

Важна прыцягнуць увагу да кніжнай выстаўкі не толькі ў Мінску, але і за яго межамі. Таму, акрамя трансляцыі шматлікіх падзей кніжнага форуму ў анлайн-фармаце, плануецца правядзенне выязных выставак-кірмашоў дзіцячай літаратуры па Беларусі. Прэзентацыі кніг для дзяцей наша кнігагандлёвая структура «Белкніга» сумесна з Міністэрствам культуры і гарадскімі бібліятэкамі наладзяць ва ўсіх гарадах — сталіцах Дня беларускага пісьменства.

***— У чым увогуле адметнасць гэтага мерапрыемства, калі мы гаворым менавіта пра беларускі фармат?***

— Кожная кніжная выстаўка, якую мне пашчасціла наведаць, мае свае адметнасці. І калі гаварыць пра нашу, то вялікі гонар выклікае менавіта той факт, што яна праводзіцца традыцыйна і нязменна вось ужо трыццаць гадоў. Я акцэнтую на гэтым увагу, бо ў іншых краінах не заўсёды такія мерапрыемствы ладзяцца на пастаяннай аснове. А ў нас Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш была і застаецца пляцоўкай дыялогу розных краін, прычым не толькі на ўзроўні выдавецтваў, але і дыпламатычных колаў. Штораз мы абмяркоўваем актуальныя тэмы, знаходзім новыя фарматы ўзаемадзеяння пісьменнікаў, кнігавыдаўцоў з чытачамі, а таксама супрацоўнічаем з грамадскімі арганізацыямі і ўсімі, хто завітвае да нас гэтымі днямі як госць. Мы выкарыстоўваем кнігу ў самых важных і патрэбных нам напрамках, для якіх яна прызначана. Дэманструем, што кніга для нас — перш за ўсё гісторыя пра стваральную працу, а не камерцыя ў чыстым выглядзе. Магчыма, па фінансавых укладаннях у арганізацыю выстаўкі нам не зраўняцца з буйнымі кніжнымі форумамі, але тая ўвага з боку дзяржавы і задачы, якія мы ставім у аснову мерапрыемства, адрозніваюць нас. І я перакананы, што гэта дае свае вынікі.

***— Як плануецца ўшанаваць на выстаўцы пісьменнікаў-юбіляраў?***

— У гэтым кантэксце сёлета ў нас плануюцца як асобныя прэзентацыі, так і прадстаўленне шырокамаштабных праектаў, якія Міністэрства інфармацыі рэалізоўвае з выдавецтвамі. Напрыклад, выдавецтва «Мастацкая літаратура» падрыхтавала некалькі прэзентацый сваіх кніжных праектаў. Мяркую, наведвальнікам будуць цікавыя іх праекты «Незабытае рэха вайны»: «Я з вогненнай вёскі...» Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка; «Ніколі не забудзем» (успаміны дзяцей Вялікай Айчыннай вайны, кніга, першае выданне якой пабачыла свет у 1948 годзе) і іншыя.

Вялікая ўвага на кніжнай выстаўцы будзе нададзена юбілеям беларускіх пісьменнікаў. Так, да 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Маўра адбудзецца прэзентацыя яго кнігі выбраных твораў. Да 75-годдзя беларускай паэтэсы Яўгеніі Янішчыц і 75-годдзя беларускага паэта Навума Гальпяровіча будуць прэзентаваны іх зборнікі, якія нядаўна пабачылі свет у серыі «Новая бібліятэка беларускай паэзіі».

У новай выдавецкай серыі «Свет класікі» будуць прадстаўлены творы беларускіх класікаў на рускай мове. Першымі ў серыі з'явіліся раман Івана Мележа «Людзі на балоце» і аповесць Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Робім мы тое свядома, каб пазнаёміць з беларускай літаратурай не толькі замежных чытачоў, але і нашу моладзь. Бо нават для папулярызацыі беларускай мовы, магчыма, варта спачатку прапанаваць маладым людзям рускую версію, якая пасля натхніць на чытанне ў арыгінале.

***— Традыцыйна на выстаўцы даведаемся і пераможцаў Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі». Чым ён здзівіў вас сёлета?***

— Пра Нацыянальны конкурс «Мастацтва кнігі» пакуль што яшчэ не магу расказваць дэтальна, бо яго вынікі — заўсёды пэўная інтрыга. Сёння ёсць шмат магчымасцяў для выдання кніг. І зрабіць кнігу, якая будзе даступнай для чытача і пры гэтым здзівіць журы нашага конкурсу — складаная справа. Аднак прыемна адзначаць, што кожны год удзельнікам тое ўдаецца. Сёлета ў творчым спаборніцтве прынялі ўдзел 144 выданні з 30 дзяржаўных і недзяржаўных выдавецтваў. Вядома, заўсёды найбольшы інтарэс выклікае кніга, удастоеная Гран-пры ў намінацыі «Трыумф», паколькі лічыцца, што гэта найлепшае выданне. Але, лічу, пераможцы і ў іншых намінацыях заслугоўваюць не меншай увагі. На выстаўцы з дадзенымі выданнямі пры жаданні можна будзе пазнаёміцца і зрабіць свае высновы. Пераможцы будуць ушанаваны на трэці дзень выстаўкі.

***— Падвядуць вынікі конкурсу «ЛітUp». Ці ўзрасла цікавасць да яго з боку творцаў?***

— Мы не чакалі, што будзе да яго такая цікавасць, што ён атрымае народнае суправаджэнне. Бо вялікая колькасць заявак нам паступала з водгукам ад людзей, што пра конкурс даведаліся праз СМІ, сацыяльныя сеткі выдавецкіх і творчых колаў і Міністэрства інфармацыі. Трэці год правядзення «ЛітUp» паказвае, што цікавасць да яго расце, пашыраецца геаграфія ўдзельнікаў. Сёлета мы атрымалі каля 200 работ, сярод якіх ужо вядомыя аўтары і тыя, хто толькі спрабуе свае сілы ў творчасці. Прыемна адзначыць, што кнігі пераможцаў мінулых гадоў пабачылі свет і сталі запатрабаванымі чытачамі. Імёны тых, хто сёлета атрымае шанц на падтрымку свайго праекта, а значыць, прыярытэтнае выданне кнігі ў дзяржаўным выдавецтве, даведаемся 25 сакавіка. У рамках выстаўкі-кірмашу таксама прэзентуем кнігі пераможцаў мінулых гадоў. Адна справа — убачыць пераможцаў, а іншая — увасобіць перамогу ў рэальна выдадзенай кнізе.

***— На ваш погляд, якая літаратура сёння найбольш запатрабаваная нашым грамадствам і якіх выданняў усё ж не хапае?***

— Думаю, сам акцэнт, які мы робім у нашых праектах, і адлюстроўвае імкненне да таго, у якім напрамку развіваецца кнігавыданне. Пісьменнікі і творчы асяродак фарміруюць тыя запыты, якія закладваюцца ў гэтыя праекты. Яны заключаюцца ў тым, што нам (Міністэрству інфармацыі, людзям, аб'яднаным у творчыя саюзы, грамадскія аб'яднанні) хочацца больш бачыць кніг, якія дапамагаюць грамадству развівацца, спрыяюць распаўсюджванню тых каштоўнасцяў, на якіх трымаецца наша дзяржава. Я часта падкрэсліваю, што чытанне кнігі не самамэта — галоўнае, што мы знаходзім там і ў якім ключы выкарыстоўваем. Кожны знойдзе ў кнізе тое, што шукае. Мы можам гаварыць сёння і пра тое, што кнігі зараз пераўтвараюцца ў камерцыйную прадукцыю. Імкненне людзей атрымаць выгаду і прыбытак ад яе рэалізацыі — тэндэнцыя часу. Таму мы ставім задачу, каб праз праекты стымуляваць пісьменнікаў, выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў на стваральную кнігу, якая дапамагае расці асобе, дае ёй разуменне сябе і тых працэсаў, якія адбываюцца навокал, садзейнічаюць развіццю нашай роднай Беларусі.

**Алена ДРАПКО.**

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «ПРИЗЫ В ПРИЛОЖЕНИИ КАТАЛОГ ONLINER 4»

Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Призы в приложении Каталог Onliner 4» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор Рекламной игры**

1.1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

**2. Наименование Рекламной игры**

2.1. Настоящая Рекламная игра называется «Призы в приложении Каталог Onliner 4».

**3. Территория проведения Рекламной игры**

3.1. Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Срок начала и окончания Рекламной игры.**

4.1. Рекламная игра проводится с 27.03.2023 по 22.05.2023 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения Рекламной игры).

**5. Цель проведения Рекламной игры**

5.1. Рекламная игра проводится в целях стимулирования потребления услуг электросвязи путем скачивания и установки на мобильные устройства приложения Каталог Onliner (далее – Приложение), а также увеличения количества пользователей Приложения и повышения их активности.

**6. Комиссия по проведению Рекламной игры**

6.1. Для проведения Рекламной игры Организатор создает комиссию по ее проведению (далее – Комиссия), осуществляющую контроль за соблюдением установленных Правил.

6.2. Состав Комиссии:

Председатель Комиссии:

– Кажуро Денис Петрович, ООО «Онлайнер», директор.

Члены Комиссии:

– Мартончик Евгений Григорьевич, ООО «Надо поговорить», директор;

– Голуб Герман Юрьевич, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник управления коммерции;

– Калинина Алена Николаевна, ООО «Онлайнер», начальник отдела продаж и ассортимента управления коммерции;

– Назаренко Лилия Александровна, ООО «Онлайнер», маркетолог отдела маркетинга.

**7. Участники Рекламной игры**

7.1. Участник – физическое лицо, установившее на мобильное устройство приложение Каталог Onliner, успешно прошедшее авторизацию в Приложении путем входа в уже существующую учетную запись (профиль) либо посредством регистрации новой учетной записи (профиля) и выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах.

7.2. В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, а также совершеннолетние иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.3. Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, члены комиссии, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**8. Порядок участия в Рекламной игре**

8.1. Для участия в Рекламной игре в период с 27.03.2023 по 16.04.2023 Участнику необходимо:

8.1.1. войти в приложение Каталог Onliner, а в случае его отсутствия – предварительно установить на мобильное устройство Приложение (версия не ниже 2.12.0 в Google Play, не ниже 2.6 в App Store и не ниже версии 2.13.0 в AppGallery);

8.1.2. совершить в приложении Каталог Onliner переход на страницу входа в уже существующую учетную запись (профиль) либо регистрации новой учетной записи (профиля), используя для этого баннер, расположенный на главной странице Приложения;

8.1.3. авторизоваться в Приложении путем входа в уже существующую учетную запись (профиль) либо посредством регистрации новой учетной записи (профиля) на заявленных Организатором условиях (https://blog.onliner.by/siterules);

8.1.4. в появившейся форме указать свои достоверные персональные данные – фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) полностью, а также ознакомиться с Правилами проведения Рекламной игры и подтвердить свое согласие на участие в игре посредством проставления «галочки» в соответствующем поле;

